

ЁЛКА Ў СТЫЛІ «ЛОФТ»

9

ПЯЦЬ ФАКТАЎ ПРА СЦЯПАНА АЛЕКСАНДРОВІЧА



13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 СНЕЖНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 246 (29615)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алена КРАТКОВА, першы намеснік міністра аховы здароўя:**

*«Важны аспект — не скараціць аб'ёмы спецыялізаванай медыцынскай дапамогі, і, трэба сказаць, гэта ўдалося. Спецыялізаваная планавая дапамога была прыпынена толькі часткова і толькі па тых напрамках, якія магчыма прыпыніць без урону для стану здароўя. Цяпер усе РНПЦ працуюць, усе спецыялізаваныя цэнтры на ўзроўні абласцей, рэгіёнаў працуюць, і аб'ёмы дапамогі ў параўнанні з мінулым годам не тое што не зменшыліся, а па некаторых напрамках нават павялічыліся».*

# Сямейны праменад



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У сужэнцаў МАЗАЛЁВЫХ з Мінска гэты год быў шчаслівы: у сям'і папаўненне — нарадзіўся хлопчык. Уладзімір працуе спецыялістам па продажы аўтамабіляў, Вольга да дэкрэтнага была дызайнерам кухоннай мэблі. А ў выхадныя яны з двухмесячным Міронам (так назвалі сына) і са старэйшай дачкой Малікай стараюцца больш бываць на свежым паветры.**

## КОРАТКА

• Генеральным дырэктарам агенцтва «Мінск-Навіны» прызначаны Андрэй Крывашэеў. У лютым мінулага года яго абралі старшынёй праўлення БСЖ.

• **Беларускія ўрачы выратавалі двухмесячнае дзіця з найцяжэйшай пнеўманіяй, выкліканай каранавірусам.**

• Наталля Барысенка пераабрана старшынёй Беларускай натарыяльнай палаты.

• **Пра калядныя традыцыі Адама Міцкевіча раскажуць у Музеі гісторыі беларускай літаратуры.**

• У Гродзенскай вобласці можа з'явіцца рэгіён-пабрацім у Іране.

• **Артылерыйскія дывізіёны УС Беларусі атрымалі новыя камандзірскія машыны кіравання.**



Вы прасілі расказаць

## НАЗАПАСІЦЬ НА СТАРАСЦЬ

### Спецыялісты патлумачылі асаблівасці добраахвотнага пенсіённага страхавання



**З кастрычніка наступнага года ў нашай краіне пачне дзейнічаць механізм дадатковай накапляльнай пенсіі. Адпаведны Указ № 367 падпісаны ў верасні бягучага года. Згодна з ім, работнік і яго работадаўца штомесячна робяць адлічэнні, якія назапашваюцца, а пры выхадзе на пенсію грамадзянін атрымлівае істотную прыбаўку да дзяржаўнай пенсіі. Хто зможа ўдзельнічаць у гэтай сістэме? Як дзяржава гарантуе захаванасць назапашаных сродкаў? Што будзе з грашыма ў выпадку смерці работніка ці пенсіянера, калі ён не паспеў атрымаць свае выплаты? Як быць, калі вы пачалі рабіць адлічэнні, але страцілі работу? На гэтыя і іншыя пытанні адказалі ўдзельнікі круглага стала, арганізаванага прэс-цэнтрам БелТА: намеснік кіраўніка Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Кацярына ЛІХАЧОВА, начальнік галоўнага ўпраўлення страхавога нагляду Міністэрства фінансаў Сяргей АСЕНКА, намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства «Стравіта» Алена ТУЛЕЙКА.**

СТАР. 4

Сацыяльны стандарт

## МАБІЛЬНАЯ АМБУЛАТОРЫЯ

### Перасовачны фельчарска-акушэрскі пункт у Зэльвенскім раёне дазваляе ахапіць медыцынскай дапамогай кожнага вясковага жыхара

**Новая форма медыцынскага абслугоўвання замяніла некалькі ФАПаў у маланаселеных вёсках. Гэта дазволіць накіраваць сэканомленыя сродкі на паляпшэнне медыцынскай базы раёна. Пакуль ФАП на колах працуе ў тэставым рэжыме. Пазней будзе складзены графік наведвання населеных пунктаў. Тут пацыенты змогуць атрымаць першую медыцынскую дапамогу, здаць аналізы, прайсці вакцынацыю супраць грыпу і ковіду. Мяркуецца стварыць і аптэчны аддзел.**

З намеснікам старшыні Зэльвенскага райвыканкама Сяргеем **ЛОЙКАМ** мы едзем па маршруце незвычайнага ФАПа. Застаём яго ў Вількаўшчыне. Па словах **участковага ўрача Веранікі ЗАГОРСКАЙ**, чыя брыгада працуе на выездзе першы дзень, у некалькіх вёсках ужо прынятыя 13 пацыентаў. На перасовачным ФАПе на пастаяннай аснове працуе фельчар, але разам з ім па графіку выязджаюць участковыя ўрачы, пры неабходнасці — вузкія спецыялісты. Медыцынскі штат укамплектаваны. Працуе нямала маладых спецыялістаў.

— Калі няма заявак, мы самі вызначаем, каго паглядзець, — кажа Вераніка Загорская. — Некаторыя звяртаюцца з павышаным ціскам, галаўнымі болямі, у такіх выпадках робім пацыенту кардыяграму.

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X

21246 9 771990 763008

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцавы



# «У АДПАВЕДНАСЦІ З ТЫМІ ЗАДАЧАМІ, ШТО БУДЗЕМ ВЫРАШАЦЬ СЁННЯ, ЗАЎТРА І ПАСЛЯЗАЎТРА»

## Прэзідэнт Беларусі з профільным міністрам разгледзелі пытанні рэструктурызацыі МЗС

**У новых знешнепалітычных рэаліях на першы план для ведамства выходзяць пытанні пазіцыянавання Беларусі за мяжой, аптымізацыі штату дыпламатаў у краінах-апанентах, замацавання экспарцёраў на перспектыўных рынках, павелічэння замежустаноў у краінах далёкай дугі, стварэння рэзерву кадраў.**

«Пытанне планавае і крыху застарэлае. Мы не так даўно, месяцы два-тры, як дамовіліся з вамі паглядзець на структуру, штатную колькасць Міністэрства замежных спраў», — пачаў Прэзідэнт размову з міністрам Уладзімірам Макеем, кіраўніком сваёй Адміністрацыі Ігарам Сергеенкам і прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам.

Па словах кіраўніка дзяржавы, нагодай для сустрэчы стала знешнепалітычная абстаноўка.

«Усе мы бачым і разумеем, што адбываецца. Асабліва на заходнім вектары нашай знешнеэканамічнай, знешнепалітычнай дзейнасці. Адсюль змяняецца наш усходні і паўднёвы вектар», — кажа кіраўнік краіны.

Па яго словах, з гэтых прычын зыходзіла даручэнне ўраду і Міністэрству замежных спраў пераглядзець структуру і колькасць супрацоўнікаў знешнепалітычнага ведамства, замежных прадстаўніцтваў.

«Вы прадставілі мне тыдзень таму свае прапановы. Я ўважліва іх вывучыў. У прынцыпе, работа праведзена сур'ёзная. Хацеў бы вас проста папярэдзіць аб недапушчальнасці нейкай «тынкоўкі» знешнепалітычнага ведамства і той сітуацыі, што складваецца на знешнім контуры нашых граніц, — дадае Прэзідэнт. — І мы калі ўзяліся за гэтае пытанне, павінны Міністэрства замежных спраў прывесці ў належны выгляд у адпаведнасці з тымі задачамі, што будзем вырашаць сёння, заўтра і паслязаўтра».

Уладзімір Макей пачаў даклад з паведамлення, што ведамствам сумесна з Адміністрацыяй Прэзідэнта, урадам падрыхтаваны комплексы план па рэфармаванні сістэмы. Для гэтага ва ўсе замежныя прадстаўніцтвы краіны адправілі запыты з просьбай выказаць сваё бачанне іх задач у новых палітычных умовах.

Пасля ў інтэрв'ю журналістам кіраўнік МЗС удакладніў, што на сустрэчы вырашылі значна скараціць дыпламатычнае прысутніцтва ў еўрапейскіх краінах і павялічыць яго ў дзяржавах СНД і далёкай дугі.

«Я не маю на ўвазе, што мы закрываем пасольствы, замежустановы. Мы скарачаем колькасць дыпламатычнага персаналу. І гэты дыпламатычны персанал мы ў значнай меры перакідваем на іншыя ўчасткі работы, іншыя кірункі, дзе яны будуць запатрабаваны», — сказаў Уладзімір Макей.

Павялічыць штат супрацоўнікаў МЗС плануюць у краінах СНД, Кітаі, Індыі, дзяржавах Афрыкі. Такую рэструктурызацыю мяркуюць ажыццявіць да новага года, прытым без павелічэння штату міністэрства.

Але Уладзімір Макей падкрэсліў, што на сустрэчы размова не ішла пра карэннае рэфармаванне МЗС. Неабходна было зрабіць крокі па ўзмацненні і павелічэнні эфектыўнасці дзейнасці ведамства, патлумачыў міністр.

«Мы бачым, што знізіўся ўзровень узаемадзеяння нашых замежных устаноў з МЗС краін акрэдытацыі. Гэта датычыцца ў першую чаргу заходніх краін. З'явілася неабходнасць узмацнення нашай дзейнасці на іншых флангах, кірунках», — акцэнтаваў увагу міністр.

Змены закрануць, як паведаміў Уладзімір Макей, не толькі пасольствы, але і цэнтральны апарат. Напрыклад, там з'явіцца аддзел Кітая.

«Мы таксама далажылі Прэзідэнту пра рэструктурызацыю цэнтральнага апарату МЗС. Маю на ўвазе ўзмацненне знешнеэканамічнай дзейнасці, інфармацыйнага складніка. Мы ў рамках цэнтральнага апарату знайшлі магчымасць за кошт пераразмеркавання рэсурсаў стварыць аддзел Кітая. Ён будзе мэтанакіравана займацца гэтай краінай, якая з'яўляецца для нас важным гандлёва-эканамічным, стратэгічным партнёрам», — заявіў міністр.

Ён таксама паведаміў, што Прэзідэнтам узгоднены прапановы па асобных кадравых прызначэннях у кіраўніцтва сістэмы МЗС.

У размове са СМІ Уладзімір Макей ацаніў і работу ведамства па экспарце. «На экспартным кірунку назіраецца прагрэс — расце валавы ўнутраны прадукт, прадпрыемствы-экспарцёры, якія трапілі пад санкцыі, знайшлі магчымасці для павелічэння паставак сваёй прадукцыі за мяжу. Гэта сведчыць, што мы можам справіцца з цяжкасцямі», — заўважыў кіраўнік міністэрства.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ПЕРШАЕ ПАСЯДЖЭННЕ Ў НОВЫМ СКЛАДЗЕ

**У канцы мінулага тыдня, пасля таго як Савет Рэспублікі даў згоду на назначэнне Ігара Карпенкі старшынёй Цэнтрвыбаркама і прайшлі выбары новых членаў камісіі, адбылося яе першае пасяджэнне, паведамляе БелТА.**

На пасяджэнні кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка прадставіў членам Выбаркама новага старшыню Ігара Карпенку. Ён таксама выказаў словы ўдзячнасці за доўгую і актыўную работу на гэтай пасадзе Лідзіі Ярмошынай. «Нас заўсёды падкуплялі ваша ўпэўненасць, найвышэйшы прафесіяналізм і ўменне знаходзіць выхад з самай складанай сітуацыі, ніколі не маркоціцца, эрудыцыя, розум і, я сказаў бы, іскрамётны гумар», — адзначыў Ігар Сергеенка.

У час мерапрыемства быў выбраны намеснік старшыні ЦВК — ім стаў дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Вадзім Іпатаў, а таксама сакратар ЦВК. Гэтую пасаду на прафесійнай аснове заняла Алена Балдоўская. Раней яна працавала начальнікам упраўлення арганізацый прававога абслугоўвання галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінскага аблвыканкама.

Ігар Карпенка адзначыў, што неабходна прааналізаваць вопыт нашай краіны і замежны, для таго каб выбудаваць нацыянальную выбарчую сістэму ў інтарэсах грамадства і суверэннай дзяржавы. «Я не па чутках ведаю гэтую работу, таму што працаваў у камітэтах гарадской камісіі, доўгі час удзельнічаў у рабоце ўчастковых камісій у якасці дэпутата Палаты прадстаўнікоў. На гэтую пасаду я выбіраўся двойчы, таму ўвесь выбарчы працэс я бачыў і з другога боку. І разумею ўвесь гэты працэс, як ён працуе знутры. Таму з апорай на новую каманду, на членаў камісіі, на апарат усе зацікаўленыя бакі выбарчага працэсу будуць выконваць сваю работу сумленна, у адпаведнасці з нашай Канстытуцыяй і заканадаўствам», — сказаў новы кіраўнік ЦВК у час выступлення ў Савеце Рэспублікі.

Сацыялогія

# УСЁ БОЛЬШАЯ АПОРА НА ЎЛАСНЫЯ СІЛЫ

**З'явіліся новыя цікавыя звесткі маштабнага сацыялагічнага даследавання «Беларусь. Меркаванне пра будучыню». Яно праводзілася ў рамках сацыялагічнага забеспячэння рэспубліканскага рэферэндуму з 15 лістапада да 4 снежня 2021 года сацыялагічным кансорцыумам ДНУ «Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі» сумесна з Аналітычным цэнтрам EcooM. Кіраўнік цэнтра Сяргей МУСІЕНКА агучыў вынікі адказаў на наступныя пытанні.**

### КАЛІ ВАША ЖЫЦЦЁ ПАГАРШАЕЦЦА, ТО ХТО Ў ГЭТЫМ ВІНАВАТЫ?

Паводле сацдаследавання, 26,2 % беларусаў лічаць, што вінаватыя самі. 19,4 % адказалі, што іх жыццё не пагаршаецца. Адказнасць на дзяржаву ўскладаюць 12 працэнтаў рэспандэнтаў, на ўрад — 11,8 %, урады іншых краін — 9,3 %, апазіцыю — 8,8 %, Прэзідэнта — 4,6 %.

«Звяртае на сябе ўвагу ўсё большая апора на ўласныя сілы, разуменне таго, што ў жыцці шмат залежыць ад цябе. І той спажывецкі элемент, які часта прысутнічаў, што табе павінны заўсёды і за ўсё, — патроху сыходзіць і адчуванне апоры на ўласныя сілы становіцца ўсё больш моцным. Людзі разумеюць, што трэба вучыцца, працаваць, набываць нейкія навыкі, таму што цяпер час настолькі хутка змяняецца, што сядзець і разлічваць на старыя напрацоўкі не даводзіцца ні дзяржаве, ні канкрэтнаму чалавеку. І вось гэтае разуменне ўсё больш у людзей узнікае і завалодвае іх розумамі», — адзначыў Сяргей Мусіенка.

### ЯКІЯ ПРАБЛЕМЫ ВЫ ЛІЧЫЦЕ НАЙБОЛЬШ АКТУАЛЬНЫМІ І ПАТРАБУЮЧЫМІ ТЭРМІНОВАГА ВЫРАШЭННЯ З БОКУ ОРГАНАЎ УЛАДЫ? (АДКРЫТАЕ ПЫТАННЕ)

У ліку актуальных праблем беларусы назвалі наступныя: дарожнае будаўніцтва і рамонт — 6,04 %, ахова здароўя — 3,29 %, заработная плата і дабрабыт грамадзян — 3,08 %, жыллёва-камунальная гаспадарка — 2,94 %, добраўпарадкаванне — 2,71 %, жыллёвая палітыка і будаўніцтва — 2,64 %, рынак працы, працоўныя месцы, занятасць насельніцтва — 1,97 %, транспартная інфраструктура — 1,23 %, адукацыя — 0,86 %, сацыяльная абарона і пенсіённая сістэма — 0,53 %.

Няма адказу ў 66,4 % рэспандэнтаў. «Па вялікім рахунку гэта адказ на тое, што сур'ёзных, глабальных праблем, пра якія варта было б казаць, у людзей не прысутнічае ў сваёй пераважнай масе. Але астатнія адказы — гэта каля 4 тысяч. І мы не маглі іх ігнараваць. Таму што гэта сур'ёзны масіў і варта прааналізаваць гэтыя праблемы», — сказаў Сяргей Мусіенка.

### ЯК ЗМЯНІЛАСЯ ВАША МАТЭРЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА ЗА АПОШНІ ГОД?

58,3 % апытаных лічаць, што не змянілася, яно крыху палепшылася або істотна палепшылася. Крыху пагоршылася — так адказалі 23,6 працэнта рэспандэнтаў, істотна пагоршылася — 13,2 %.

«Мы не спынялі вытворчасці, у нас няма даўгоў па выплаце заработнай платы. І гэта палітыка дзяржавы, якая праводзіцца і захоўваецца. Асобныя катэгорыі насельніцтва атрымалі істотную прыбаўку да зарплаты: урачы, настаўнікі. І гэта знайшло сваё адлюстраванне, — сказаў Сяргей Мусіенка. — Ёсць некаторая незадаволенасць, якая звязана з тым, што хтосьці не з'ездзіў у водпуск на мора, абмежаванне руху накладае нейкі адбітак у цэлым на адчуванне рэальнага дабрабыту. Хоць, вы ведаеце, у канцы года многія прамысловыя прадпрыемствы і прыватныя прадпрымальнікі свабодна ўздыхнулі ў сувязі з істотным падзеннем курса долара і еўра да беларускага рубля. І гэта аказала станоўчы ўплыў на ўвесь бізнес-клімат. Разам з тым звяртае ўвагу, што ёсць істотная катэгорыя людзей, якая гаворыць аб пагаршэнні іх матэрыяльнага становішча. Але вельмі часта гэта чаканне большага павелічэння заработнай платы або даходу. Але ў цэлым, лічу, мы вельмі дастойна гэты ковідны год праходзім — без лакдаўнаў, закрыццяў і каранцінаў».

**Паводле БелТА.**

КАЛІ ВАША ЖЫЦЦЁ ПАГАРШАЕЦЦА, ТО, ЯК ВЫ ЛІЧЫЦЕ, ХТО Ў ГЭТЫМ ВІНАВАТЫ?




ЯКІЯ ПРАБЛЕМЫ ВЫ ЛІЧЫЦЕ НАЙБОЛЬШ АКТУАЛЬНЫМІ І ПАТРАБУЮЧЫМІ ТЭРМІНОВАГА ВЫРАШЭННЯ З БОКУ ОРГАНАЎ УЛАДЫ? (АДКРЫТАЕ ПЫТАННЕ)

*У месцы вашага пражывання*




ЯК ЗМЯНІЛАСЯ ВАША ЎЛАСНАЕ МАТЭРЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА ЗА АПОШНІ ГОД?



Кантэкст

# «ЦЕЛЫ МІГРАНТАЎ ЗАКАПАНЫЯ АБО РАЗАДРАНЫЯ ВАЎКАМІ, АЛЕ БОЛЬШАСЦЬ У ЯМАХ»

## Жудасныя падрабязнасці пра злачынствы польскіх сілавікоў агучыў іх былы саслужывец

**Польскі вайсковец Эміль Чэчка, які папрасіў палітычнага прытулку ў Беларусі, расказаў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» новыя жудасныя падрабязнасці пра злачынныя загады кіраўніцтва. Паводле яго слоў, вайскоўцаў апрацоўвалі псіхалагічна, потым паілі алкаголем і прымушалі пад прыцэлам пісталета расстрэльваць бежанцаў у лесе.**

### «МЫ ЗАЎСЁДЫ ЗАБІВАЛІ»

Падчас інтэрв'ю Эміля Чэчку спыталі, як паводзілі сябе тыя людзі перад расстрэлам, ці казалі яны нешта ў гэты момант. «Я не хачу, прабачце, аб гэтым казаць. Адны плачуць, другія крычаць. Іншыя стаяць проста прама», — адказаў ён. Яшчэ адно пытанне датычылася таго, ці даводзілася дабіваць параненых. «Я чуў, што былі такія людзі, іх трэба было дабіць. А што трэба было з імі рабіць, жывымі закопваць? — сказаў Эміль Чэчка. — Казалі: дабіце іх!»

Што да інфармацыі аб тым, што ён быў некаторы час таму затрыманы ў нецвярозым стане за рулём аўтамабіля, польскі вайсковец адказаў на пытанне з сарказмам. «Так, і таму збег праз калючы дрот, таму што ў мяне забралі правы. Выдатны падыход! Ну так, звычайны п'яніца... — сказаў ён. — Кожны раз, калі я расказваў які-небудзь выпадак, да якога нас прымушалі, заўсёды за гэтым стаяла вялікая колькасць алкаголю, які давалі салдатам. А потым кажуць, што ехаў п'яным».

Падчас інтэрв'ю польскі ваеннаслужачы распавёў, што ў нейкі момант на месца яго службы пачалі прыязджаць машыны з пагранічнікамі і забіраць з сабой яго калег. Першымі ўзялі Эміля Чэчку і яго калегу. На дарозе ім прапанавалі выпіць. Дабраўшыся да месца, яны ўбачылі некалькі чалавек. «Адзін у другога пагранічніка пытаўся, ці перазараджаць зброю. А калі мы спыталі, навошта, яны сказалі перазараджаць і пачалі цэліцца нам у галаву, каб прымусіць нас страляць. На першым патруляванні мы былі п'яныя, па дарозе лавілі адзінокага чалавека, везлі яго ў лес, выкопвалі яму, і проста на нашых вачах пагранічнікі стралялі яму ў галаву», — расказаў ён.

Эміль Чэчка адзначыў, што адчувае віну за свае ўчынкі, нават нягледзячы на тое, што яны адбываліся пад прымусам. Вайсковец прызнаўся, што яму даводзілася забіваць людзей. Паводле яго слоў, упершыню гэта адбылося ў маі. «Гэта немагчыма апісаць. Проста такое пачуццё, як быццам хтосьці камусьці разарваў душу, а потым чалавек адчувае сябе, быццам у яго няма душы», — сказаў Эміль Чэчка. Польскі вайсковец падкрэсліў, што такое немагчыма забыць. «Твары гэтых людзей запамінаюцца назаўжды. Твары толькі першых — тых, каго сказалі забіць. А потым ужо чалавек не глядзіць у твар, толькі цэліцца ў грудную клетку», — дадаў ён.

Па яго словах, сярод тых, каго забівалі польскія пагранічнікі, былі валанцёры і мігранты. «Ніколі не было такой сітуацыі, каб мы праводзілі мігрантаў і іх не забілі. Мы заўсёды забівалі. Целы мігрантаў закапаныя або разадраныя ваўкамі, але большасць у ямах. Мне цяжка сказаць, колькі там магіл. Туды проста павінен трапіць Чырвоны Крыж і ўсё гэта расследаваць».

### ПОРУЧ СА ЗЛАЧЫНСТВАМ

«Затрыманне ў прыгранічнай паласе польскага ваеннаслужачага Эміля Чэчкі і яго зварот з просьбай аб атрыманні палітычнага прытулку з'яўляецца чарговай вяхой, якая сведчыць аб крызісе заходняй дэмакратыі, — заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка, паведамілі БелТА ў прэс-службе Палаты прадстаўнікоў. — Інтэрв'ю, дадзенае гэтым маладым чалавекам прадстаўнікам беларускіх СМІ, пацвярджае неапраўданую жорсткасць польскіх улад, якая мяжуе са злачынствам, у адносінах да мігрантаў, якія паверылі ў «еўрапейскую светлую будучыню». Псіхіка маладога паляка не справілася з дысанансам паміж палітычнымі лозунгамі і рэальнасцю, а сам ён абраў альтэрнатыўны шлях, падказаны сумленнем».

Спікер канстатаваў: праўда, якая транслюруецца беларускім бокам, «не даспадобы прыхільнікам заходняй дэмакратыі, а любыя адхіленні ад генеральнай лініі Еўрапейскага саюза недапушчальныя». Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што Беларусь заўсёды праводзіла выключна міралюбівую палітыку, накіраваную на добрасуседства і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва. «Працяг канфрантацыі — горшы з магчымых сцэнарыяў развіцця абстаноўкі, а мова санкцый недапушчальная ў XXI стагоддзі», — дадаў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Як заўважыў у эфіры тэлеканала АНТ намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Аляксандр Маркевіч, названыя польскім ваеннаслужачым факты сведчаць аб чалавеканенавісніцкіх дзеяннях, прамых фактах забойстваў грамадзян — як бежанцаў, так і прадстаўнікоў праваабарончых арганізацый. «І яны маюць патрэбу ў дасканалай праверцы. Гэта вельмі сур'ёзны момант, на які неабходна звярнуць увагу. Наш парламент будзе акцэнтаваць на гэтым увагу, — дадаў ён. — Але і мы не забываем, што нашай краінай узбуджаны крымінальныя справы па фактах прымянення спецыяльных сродкаў, святлошумавых гранат з боку Польшчы па бежанцах, якія знаходзяцца на нашай тэрыторыі. Гэтыя справы расследуюцца, рыхтуюцца дакументы для накіравання ў міжнародныя структуры». Уражвае маўчанне структур АБСЕ, яго Парламенцкай асамблеі. «Ёсць Савет дзяржаў Балтыйскага мора, структуры ААН, якія займаюцца правамі чалавека. І тут іх актыўная роля павінна быць», — адзначыў Аляксандр Маркевіч.

### КРЫМІНАЛЬНАЯ СПРАВА

Яшчэ да з'яўлення шакавальнай інфармацыі, агучанай польскім вайскоўцам, Генеральная пракуратура абагульніла матэрыялы крымінальнай справы аб злачынствах польскіх сілавікоў у дачыненні да бежанцаў. Мяркуецца, што Беларусь перадасць іх міжнародным структурам, заявіў у эфіры тэлеканала АНТ афіцыйны прадстаўнік Генпракуратуры Дзмітрый Брылёў. «Прадстаўнікі ўлады Польшчы неадназова ажыццяўлялі незаконную дэпартацыю ў дачыненні да бежанцаў і цяпер гэта робяць, прымянялі катаванні, іншыя акты жорсткасці. Сілавы блок гэтай дзяржавы рэалізаваў яўна неадпаведныя арганізацыйныя і тэхнічныя мерапрыемствы: ваенізаваныя, узброеныя патрулі, ачапленне, узбраенне. У адносінах, па сутнасці, безабаронных людзей прымяняліся, у тым ліку ноччу, дэманстратыўныя стрэлы ў паветра, выбухі, асляпляльнае асвятленне, спецыяльныя сродкі», — сказаў Дзмітрый Брылёў. Паводле яго слоў, Генпракуратура Беларусі накіравала ў Савет Міністраў, а таксама ў Палату прадстаўнікоў копіі матэрыялаў крымінальнай справы ў пяці тамах на рускай і англійскай мовах «з просьбай арганізаваць іх перадачу міжнародным і еўрапейскім структурам, у тым ліку Еўрапарламент, для дачы прававой ацэнкі тым падзеям, якія ў іх выкладзены».

### ХАДАЙНІЦТВА ПРЫНЯТА ДА РАЗГЛЯДУ

Эміль Чэчка звярнуўся ў цэнтр «Сістэмная праваабарона» з просьбай аб дапамозе ў абароне яго правоў і атрыманні статусу бежанца, паведаміла БелТА са спасылкай на тэлеграм-канал цэнтра. Таксама стала вядома, што яго хадайніцтва аб атрыманні статусу бежанца прынята да разгляду. Аб гэтым заявіў у відэакаментарыі ў тэлеграм-канале МУС начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Аляксей Бягун. «У органы ўнутраных спраў з пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Законам «Аб прысваенні замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства статусу бежанца, дадатковай і часовай абароны ў Рэспубліцы Беларусь» паступіла хадайніцтва грамадзяніна Польшчы Эміля Чэчкі аб прысваенні статусу бежанца, дадатковай абароны або прытулку ў Рэспубліцы Беларусь. Хадайніцтва прынята да разгляду, і па ім будзе прынята законнае рашэнне», — распавёў Аляксей Бягун.

Па яго словах, тэрмін разгляду такіх хадайніцтваў складае да 6 месяцаў. «Пры неабходнасці тэрмін разгляду можа быць прадоўжаны да 3 месяцаў», — дадаў начальнік дэпартамента. Аляксей Бягун падкрэсліў: цяперашняя сітуацыя ў галіне разгляду хадайніцтваў замежных грамадзян і асоб без грамадзянства аб прысваенні статусу бежанца супастаўная з аналагічнымі лічбамі мінулага года. «Мы ўжо зарэгістравалі каля 500 хадайніцтваў іншаземцаў аб прысваенні статусу бежанца або дадатковай абароны. Пры гэтым, вядома, неабходна адзначыць, што доля грамадзян Украіны, якія хадайнічаюць аб статусе бежанца або дадатковай абароне, змяншаецца з улікам прынятага рашэння Прэзідэнта аб натуралізацыі гэтай катэгорыі асоб. З іншага боку — павялічваецца колькасць грамадзян трэціх дзяржаў, якія хадайнічаюць аб наданні статусу бежанца або дадатковай абароны ў Беларусі», — заўважыў Аляксей Бягун.

Польскі вайсковец быў дапытаны следчымі «з мэтай праверкі і дакументавання апублікаваных фактаў, у тым ліку аб забойствах людзей на польскай граніцы, у рамках крымінальнай справы, якую расследуе Следчы камітэт». «Следствам будзе дадзена прынцыповая ацэнка ўсім злачынным дзеянням польскіх сілавікоў», — заўважылі ў камітэце. І крымінальная справа папоўніцца новымі фактамі.

**Пётр ДУНЬКО.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Новым прэзідэнтам Чылі стаў Габрыэль Борыч



Па выніках другога тура пераможцам выбараў кіраўніка дзяржавы стаў кандыдат ад сіл левага кірунку Габрыэль Борыч — 35-гадовы студэнцкі лідар і дэпутат без віхляга палітычнага вопыту і вагі. Ён падзякаваў свайму саперніку Хасэ Антоніа Касту за ўдзел у выбарах і заявіў аб гатоўнасці разгледзець яго прапановы аб развіцці краіны. «Лічу важным падзякаваць усім кандыдатам, якія ўдзельнічалі ў гэтых выбарах. Дзеля будучыні Чылі мы ўсе павінны быць на баку народа», — сказаў Габрыэль Борыч падчас свайго першага выступлення ў якасці абранага прэзідэнта. Паводле даных, якія апублікавала выбарчая служба рэспублікі, за яго прагаласавалі 55,87 % выбаршчыкаў, за Касту — 44,13 %. Борыч павінен будзе заступіць на пасаду кіраўніка дзяржавы 11 сакавіка наступнага года. Ён стане самым маладым прэзідэнтам у гісторыі краіны — на момант інаўгурацыі яму будзе 36 гадоў.

### Колькасць ахвяр тайфуну «Раі» на Філіпінах перавысіла 370 чалавек

Не менш як 375 чалавек загінула з-за наступстваў тайфуну «Раі» на Філіпінах, у асноўным на астравах Себу і Бахол. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на газету Manila Bulletin, дзе былі апублікаваны даныя паліцыі краіны. «Раі» стаў 22-м тайфунам у гэтым сезоне. Ён сфарміраваўся 16 снежня ў заходняй частцы Ціхага акіяна, аб чым паведаміла метэаралагічная абсерваторыя Ганконга. Прадстаўнік прэзідэнта Філіпін Карла Награлес паведаміў, што больш за 332 тысячы чалавек было эвакуіравана да набліжэння тайфуну, 15 тысяч з іх трапілі ў эвакуацыйныя цэнтры. Як вядома, каля 20 штармоў і тайфунаў абвальваецца на Філіпіны штогод. Архіпелаг размешчаны ў Ціхаакіянскім вулканічным вогненным кольцы, у якім знаходзіцца большасць вулканаў на Зямлі і дзе адбываецца мноства стыхійных бедстваў.

### Брус Спрынгсцін атрымае за каталог сваіх песень рэкордныя $500 млн



Амерыканскі музыкант Брус Спрынгсцін, 20-разовы ўладальнік «Грэмі», прадасць правы на поўны каталог сваіх песень кампаніі Sony. Аб гэтым The New York Times паведамілі крыніцы. У яго ўвайшлі 20 студыйных альбомаў, у тым ліку і плацінавыя — «Born in the US», «Born to Run», «Darkness on the Edge of Town і The River». Сума здзелкі стане рэкорднай для музычнага рынку, гэты музычны кантракт будзе самым дарагім у гісторыі. Папярэдні рэкорд на кошце належыць Бобу Дылану. Поўны каталог песень быў прададзены ў снежні 2020 года Universal Music Group за $300 млн. Каталог песень Дэвіда Боўі ацанілі ў $200 млн. У маі гэтага года генеральны дырэктар Sony Music Роб Стрынгер заявіў, што за папярэднія паўгода кампанія выдаткавала $1,4 млрд на набыткі, у тым ліку па здзелку па куплі каталога песень Пола Саймана ($250 млн).

## ТУМАННЫ АЛЬБІЁН ДЫПЛАМАТЫІ

**Нядзельным вечарам невядомыя напалі на Пасольства Беларусі ў Лондане.**

Спачатку быў сапсаваны фасад будынка замежнай установы, а затым цялесныя пашкоджанні атрымалі беларускія дыпламаты. Пра гэта паведаміла прэс-служба МЗС.

Аднаму з дыпламатаў пасля інцыдэнту спатрэбілася тэрміновая медыцынская дапамога. У яго дыягнаставалі пералом носа, страсенне мозгу лёгкай ступені і пашкоджанне зуба.

Частку злачынцаў затрымала паліцыя.

Як мяркуецца, яны ўваходзяць у радыкальную эміграцкую групоўку «Надзея».

«У МЗС Беларусі выкліканы Часовы павераны ў справах Вялікабрытаніі, якому заяўлены рашучы пратэст з патрабаваннем аб правядзенні ўважлівага расследавання інцыдэнту, прыцягненні да адказнасці вінаватых асоб, а таксама інфармаванні беларускага боку аб ходзе правядзення працэсуальных дзеянняў і іх выніках», — заявіла прэс-служба МЗС.

Ведамства выказвае надзею, што брытанскімі ўладамі будуць прыняты ўсе належныя меры для абароны памяшкання прадстаўніцтва ад усялякага ўварвання або нанясення шкоды і для прадухілення парушэння спакою прадстаўніцтва.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# НАЗАПАСІЦЬ НА СТАРАСЦЬ

## РАБОТАДАЎЦА АБАВЯЗАНЫ РАБІЦЬ АДЛІЧЭННІ

**К. Ліхачова:** — Сёння ў Беларусі пражывае каля 2,4 мільёна грамадзян пенсіённага ўзросту. У год на забеспячэнне выплаты пенсій выдаткоўваецца каля 14 мільярдаў рублёў, а гэта больш чым мільярд штомесяц. Калі казаць пра салідарную сістэму, якая цяпер дзейнічае, то яна прадугледжвае абавязковы ўдзел працоўных грамадзян — кожны выплачвае ўзносы (1 % ад заработнай платы), гэтак жа іх выплачвае і работадаўца (28 % ад заработнай платы). Яны выкарыстоўваюцца для далейшага фарміравання пенсіённых правоў грамадзяніна. Сродкі акумулююцца ў фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва, які штомесячна фінансуе выплаты пенсій.

***— Чаму важна прыцягваць насельніцтва да праграмы добраахвотнага пенсіённага страхавання?***

**А. Тулейка:** — Сёння, выходзячы на пенсію, людзі хочуць жыць крыху па-іншаму. Не толькі ўдзяляць увагу сваім родным, але і асвойваць нешта новае, развіваць хобі, атрымліваць дадатковыя ўражанні, напрыклад падарожнічаць. Таму ў дадатак да існуючай пенсійнай сістэмы патрабуецца ўдзел у тым ліку і грамадзян у частцы назапашвання дадатковага даходу на старасць. Калі падсумаваць, гэта робіцца для захавання свайго звыклага ладу жыцця пасля выхаду на пенсію, павелічэння даходу ў пенсіённым узросце.

***— Як гэты механізм будзе працаваць?***

**А. Тулейка:** — Пры заключэнні дагавора дадатковага накапляльнага пенсіённага страхавання грамадзянін будзе рабіць адлічэнні са сваёй заработнай платы, і, безумоўна, іх будзе рабіць работадаўца. Прычым для апошняга гэта будзе не права, а абавязак, калі яго работнік вырашыў удзельнічаць у гэтай сістэме. На сёння вызначаны такія памеры выплат: работнік са сваёй заработнай платы можа адлічваць да 10 %, работадаўца — да 3 %. Калі работнік адлічвае 1 %, то і работадаўца 1 %, калі 2 %, то і работадаўца 2 %, і калі работнік адлічвае ад 3 да 10 %, то работадаўца адлічвае 3 %.

Самы папулярны на сёння механізм — гэта тры плюс тры. Калі б схема, якая прапануецца, ужо дзейнічала і грамадзянін, скажам, з 45 гадоў пачаў назапашваць, а ў 63 пайшоў на пенсію, атрымліваючы сярэднюю заработную плату, то яго дадатковая накапляльная пенсія склала б 244 рублі (калі яе выплачваць на працягу пяці гадоў) і 142 рублі (на працягу 10 гадоў). Хачу звярнуць увагу, што падчас працы ён бы выплачваў каля 13,5 рубля штомесяц. Адпаведна, чым большы яго ўзнос, тым большая налічана пенсія.

## КОЛЬКАСЦЬ АХВОТНЫХ РАСЦЕ

— Да прыняцця 367-га ўказа існавала добраахвотнае пенсіённае страхаванне, якое дазваляла назапашваць сабе на старасць. Чаму ім не вельмі актыўна карысталіся дагэтуль?

**С. Асенка:** — Тых, хто заключыў дагаворы добраахвотнага пенсіённага страхавання, — каля 4,8 %. Паказчык невысокі, але ён павялічваецца: яшчэ дзесяць гадоў таму такіх людзей было 3 %. З прыняццем 376-га ўказа, хоць ён і пачне рэалізоўвацца толькі ў кастрычніку наступнага года, цікавасць да накапляльнага страхавання павялічваецца. Указ прыняты ў верасні бягучага года, а за кастрычнік колькасць людзей, якія заключылі добраахвотныя дагаворы страхавання, вышэйшая за сярэднямесячную. Напрамую шукаць тут сувязь няправільна, але пэўны ўнёсак у цікавасць да пенсіённага страхавання ўказ зрабіў. Страхавыя кампаніі правялі сустрэчы з калектывамі, расказалі пра свае прадукты, якія цяпер ёсць на рынку. І можна меркаваць, што колькасць грамадзян, ахопленых пенсіённым страхаваннем, будзе толькі павялічвацца.

**А. Тулейка:** — Сапраўды, у грамадзян выклікае жывую цікавасць, што ж будзе, многія ўжо сёння хацелі б уключыцца ў гэту сістэму і заключыць дагаворы. Гэта заўважна і па рабоце нашага кантакт-цэнтра, бо колькасць званкоў вырасла. Мы тлумачым, што сістэма пачне працаваць толькі з 1 кастрычніка 2022 года, расказваем, якім будзе механізм і як будуць назапашвацца грашовыя сродкі. Людзей прыцягвае тое, што і работадаўца мусіць удзельнічаць.

**К. Ліхачова:** — Пры гэтым работадаўца не нясе ніякіх дадатковых затрат, яны пакрываюцца фондам сацыяльнай абароны насельніцтва. За кошт таго, што прадпрыемства заплаціла за працоўнага грамадзяніна гэты ўзнос, зменшаецца выплата ў фонд.

***— Ці ёсць у буйных прадпрыемстваў запыт на добраахвотнае пенсіённае страхаванне?***

**А. Тулейка**: — На сёння ў нас ёсць застрахаваныя буйныя юрыдычныя асобы дзяржаўнай і недзяржаўнай формаў уласнасці, якія такім чынам фарміруюць сацыяльны пакет свайго прадпрыемства. І калі падтрымку аказвае дзяржава, безумоўна, цікавасць узрастае. Павялічваецца і цікавасць грамадзян: цікавасць, ці будзе гэта замяшчэннем той сістэмы, якая сёння працуе ў рамках добраахвотнага пенсіённага страхавання. Работадаўцы пытаюцца, як гэта будзе дзейнічаць. Прафсаюзныя арганізацыі актыўна падключаюцца: гэта дадатковы механізм абароны грамадзян.

***— Што робіцца, каб пра існаванне такога механізму даведалася як мага больш людзей?***

**К. Ліхачова:** — Сумесна са «Стравітай» мы распрацавалі план інфармацыйных мерапрыемстваў. Дзяржорганы звяртаюцца да нас з запытам правесці семінары, і мы выязджаем у працоўныя калектывы. За час з кастрычніка 2021 года да чэрвеня 2022 года плануем аб'ехаць усе буйныя арганізацыі з колькасцю працоўных больш за 500 чалавек. Таксама праводзім семінары і вэбінары, дзе шырокаму колу ўдзельнікаў тлумачым парадак уплаты ўзносаў, бальнічных, дапамог, і там заўсёды расказваем пра добраахвотную страхавую пенсіённую сістэму. Да пачатку рэалізацыі ўказа мы раслумачым сістэму.

***— Пакуль дагаворы па добраахвотным пенсіённым страхаванні заключаюць «Стравіта» і «Прыёрбанк». Ці плануецца павелічэнне гэтых арганізацый з пачаткам рэалізацыі новага механізма па 367-м указе?***

**С. Асенка:** — На дадзены момант такое страхаванне ўпаўнаважана ажыццяўляць дзяржаўная страхавая кампанія «Стравіта».



## НАЗАПАШАНАЕ АТРЫМАЮЦЬ СПАДЧЫННІКІ

***— Раскажыце, як будзе дзейнічаць новы механізм. Хто ў ім можа ўдзельнічаць?***

**А. Тулейка:** — Удзельнічаць у дадатковым накапляльным пенсіённым страхаванні мае права працоўны грамадзянін, за якога плацяць узносы ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту яму павінна заставацца не менш за тры гады. Выплата дадатковай накапляльнай пенсіі будзе ажыццяўляцца штомесячна пасля дасягнення ім агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту роўнымі долямі на працягу тэрміну, які ўкажа сам грамадзянін. Сёння ён складае пяць або дзесяць гадоў. Гэты тэрмін грамадзянін будзе вызначаць самастойна падчас заключэння дагавора страхавання.

***— Каму дастануцца назапашаныя сродкі ў выніку смерці пенсіянера ці яшчэ працоўнага грамадзяніна?***

**А. Тулейка:** — Грашовыя сродкі, якія будзе назапашваць грамадзянін, з'яўляюцца спадчыннымі. Разгледзім дзве сітуацыі. Калі чалавек памірае падчас дзеяння дагавора страхавання ў перыяд накаплення грашовых сродкаў, яго спадчыннікі атрымліваюць грашовыя сродкі, назапашаныя на імянным асабовым рахунку. Другая сітуацыя, калі смерць страхаўніка наступае на стадыі атрымання дадатковай накапляльнай пенсіі. Тады яго спадчыннікі атрымаюць тыя грашовыя сродкі, якія ім яшчэ не атрыманы і захоўваюцца на яго імянным асабовым рахунку.

**С. Асенка:** — Важна падкрэсліць, што грашовыя сродкі захоўваюцца на імянным асабовым рахунку, з якога грамадзянін і будзе атрымліваць сваю дадатковую пенсію. Пры жаданні чалавек у свабодным рэжыме можа ўвайсці ў асабісты кабінет і паглядзець назапашванні, прасачыць, як мяняецца яго асабовы рахунак. Гэта інфармацыя стане даступная, і кагосьці, магчыма, будзе стымуляваць падчас назапашвання адлічваць не адзін працэнт, а ўжо тры.

**А. Тулейка:** — Гэтыя грашовыя сродкі маюць мэтавае прызначэнне і не падлягаюць канфіскацыі — заканадавец гэта дакладна вызначыў. Ужо сёння існуе асабісты кабінет карыстальніка, і ён яшчэ будзе дапрацаваны.

***— Ці можна ўносіць карэктывы ў заключаны дагавор страхавання?***

**А.Тулейка:** — Такое права ёсць, але не часцей, чым раз на год.

***— Ці можна забраць грошы датэрмінова?***

**А. Тулейка:** — Механізм 367-га ўказа не прадугледжвае датэрміновага спынення дагавора страхавання. Сітуацыі, пры якой грашовыя сродкі могуць быць выплачаны датэрмінова, — смерць страхаўніка ці атрыманне інваліднасці І або ІІ групы. У такім выпадку дагавор датэрмінова спыняецца, і грамадзяніну, які атрымаў інваліднасць, грашовыя сродкі выплачваюцца датэрмінова. Гэта назапашаныя грашовыя сродкі з даходнасцю.

***— Як быць, калі заключыў дагавор дадатковага пенсіённага страхавання, а праз некаторы час даход стаў меншы ці ўвогуле чалавек страціў работу?***

**К. Ліхачова:** — Можна часова спыняць свой удзел у праграме. Калі чалавекаднойчы ўступіў у сістэму, ён знаходзіцца ў ёй пажыццёва, і сродкі назапашваюцца, і захоўваюцца. Каб прыпыніць свой удзел, ён піша заяву ў страхавую кампанію.

**А. Тулейка:** — Калі ў грамадзяніна некалькі работадаўцаў, ён у праве звярнуцца з заявай да аднаго з іх, з кім яму найбольш цікава ўдзельнічаць у праграме. Прычым работадаўца — гэта не толькі той, з кім заключаны кантракты і працоўныя дагаворы, што мы называем «работа ў штаце». Гэта і грамадзянска-прававыя дагаворы. Выконваючы работу у рамках такіх дагавораў, грамадзянін мае права ўдзельнічаць у накапляльнай пенсіённай сістэме страхавання.

## КАБ ГРОШЫ НЕ ПРАПАЛІ...

***— Як будзе забяспечвацца захаванасць назапашаных грашовых сродкаў?***

**А. Тулейка:** — Найперш пры заключэнні дагавора захаванасці на грашовыя сродкі налічваецца даходнасць. Згодна з указам, яна ўстаноўлена ў памеры стаўкі рэфінансавання. Акрамя таго, налічваецца дадатковая даходнасць у страхавы фонд, якая складае не менш за 50 % з прыбытку ад ажыццяўлення інвестыцый. Гэтыя сродкі таксама накіроўваюцца на накапленні грамадзян.

Што датычыцца гарантаванай захаванасці грашовых сродкаў, наша дзейнасць сёння дастаткова празрыстая, мы ўкладваемся ў найбольш ліквідныя, прыбытковыя зваротныя інструменты фінансавання. Безумоўна, адсочваем, каб яны былі надзейнымі. Работа кампаніі «Стравіта» стабільная, але разам з тым заканадавец прадугледзеў фарміраванне гарантыйнага фонду. Вызначана, што туды страхаўшчык адлічвае не менш за 0,5 % ад узносаў па дадзеным відзе страхавання. Гарантыйны фонд можа быць выкарыстаны на такія неспрыяльныя сітуацыі.

**С. Асенка:** — Калі штосьці здарыцца са страхавой кампаніяй, выплаты будуць ажыццяўляцца дзяржавай.

***— Ці ўлічваўся пры распрацоўцы дадзенага ўказа сусветны вопыт?***

**А. Тулейка:** — Безумоўна, пры распрацоўцы ўказа ўлічваўся сусветны вопыт. Падобная сістэма працуе ўжо амаль ва ўсіх еўрапейскіх краінах. Напрыклад, у Даніі, Нідэрландах, Швецыі дзяржаўная пенсія дапаўняецца падобнымі адлічэннямі, якія ахопліваюць каля 90 % работнікаў, гэта дазваляе пры выхадзе на пенсію грамадзянам атрымліваць дадатковы даход. Таксама ў Германіі дзяржаўная пенсія дапаўняецца вытворчай. Такім чынам, да мінімальнай дзяржаўнай пенсіі ідуць назапашванні дадатковай. Сістэма існуе ў многіх краінах Еўропы і апрабавана на працягу многіх гадоў.

***— Чаму накапляльная сістэма не заменіць дзяржаўную пенсію? Ці паўплываюць адлічэнні, якія будзе рабіць работадаўца за работніка, на памер дзяржаўнай пенсіі?***

**К. Ліхачова:** — Мэтай новага механізму з'яўляецца не замена пенсіі, а павышэнне забяспечанасці грамадзян. Ніякіх змяненняў у сістэму дзяржаўнага сацыяльнага страхавання ўносіцца не будзе. За грамадзян, якія будуць удзельнічаць у сістэме добраахвотнага пенсіённага страхавання, узносы ў фонд работадаўца будзе плаціць у меншым памеры. І гэта ніяк не паўплывае на памер пенсіі. Пенсія залежыць толькі ад сфарміраванага працоўнага стажу і заработнай платы.

***— Чаму так шмат часу патрабуецца на ўступленне ў сілу ўказа?***

**К. Ліхачова:** — Так, сапраўды, гэта цэлы год, за які мы павінны давесці да грамадзян інфармацыю пра сам указ. А таксама правесці тэхнічныя мерапрыемствы ў фондзе сацыяльнага развіцця насельніцтва, Міністэрстве працы і сацыяльнага абслугоўвання, «Стравіце» і на прадпрыемствах, каб бухгалтарскія службы не былі нагружаны дадатковымі работамі і каб грамадзяніну камфортна было атрымліваць інфармацыю ў асабістым кабінеце.

**Алена КРАВЕЦ.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)




**У суботу ў сталічным гандлёвым цэнтры «Замак» адкрыўся ўнікальны гандлёвы аб'ект — крама, у якой можна набыць майку або байку з цытатай кіраўніка краіны. «Будзе вельмі цікава», «Прэзідэнтамі не становяцца, прэзідэнтамі нараджаюцца», «Любімую не аддаюць» — гэтыя і іншыя рэзанансныя выказванні Прэзідэнта «пасяліліся» на трыкатажных вырабах беларускай вытворчасці. Дарэчы, не дарагіх — майка каштуе 20 рублёў, цяплейшая байка — 40.**



# МЕРЧ АД ПЕРШАГА

У дзень адкрыцця крамы назіраўся сапраўдны ажыятаж. Ахвотных набыць эксклюзіўны тавар было столькі, што да абслугоўвання пакупнікоў далучылася кіраўнік «Беллегпрама» Таццяна Лугіна, якая прысутнічала на адкрыцці. Яна ж пасля расказала журналістам, што з-за павышанага попыту ў найбліжэйшы час плануецца адшываць новыя партыі тавару з мерчам ад Прэзідэнта.




Яна таксама адзначыла, што, улічваючы блізкія калядныя і навагоднія святы, вельмі шмат людзей купляе тавары з крамы ў падарунак.

Таццяна Лугіна расказала, што найбольшай папулярнасцю карыстаюцца мадэлі адзення з фразай «Распранайся і працуй». Часцей за ўсё гэта выбар пакупнікоў-мужчын. А вось «Любімую не аддаюць» бяруць больш людзі ва ўзросце, у тым ліку шлюбныя пары. Плануецца, што напярэдадні навагодніх свят выручка ад продажу часткова пойдзе на дабрачыннасць, падарункі дзецям.

У цэлым пакупнікам абяцаюць новыя сюрпрызы. «Праект толькі запусцілі. Мы да Новага года плануем яшчэ некаторыя сюрпрызы ў краме з вырабамі, якія будуць звязаны і з Прэзідэнтам, і з Новым годам. Таму ўсё адразу не раскрылі, каб цікавасць падаграваць і далей. Нейкія «фішачкі» ў нас яшчэ назапашаны», — дадала кіраўнік «Беллегпрама».

Сярод першых пакупнікоў былі і вядомыя асобы. На адкрыццё крамы прыйшлі намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Луцкі, міністр інфармацыі Уладзімір Пярцоў, старшыня Камітэта дзяржкантролю Васіль Герасімаў. Касманаўт Алег Навіцкі набыў майку з надпісам «Прэзідэнтамі не становяцца, прэзідэнтамі нараджаюцца», аб чым і паведаміў у сацыяльных сетках, сфатаграфаваўшыся ў абноўцы.

**Фота БелТА.**







# МАБІЛЬНАЯ АМБУЛАТОРЫЯ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Таксама бяром аналізы, можам правесці гінекалагічны агляд, для гэтага ёсць спецыяльнае крэсла. Усё, як на звычайным ФАПе. Вядома, праводзім вакцынацыю. Многія сталыя жыхары ўжо прышчэпленыя другой дозай. Усяго ў раёне вакцынавана 40 % насельніцтва.

Зрабіць прышчэпку мяркуе жыхар Вількаўшчыны Станіслаў Іванавіч. Ён прыйшоў у перасоўны ФАП са скаргамі на болі ў спіне. Тут у яго ўзялі аналізы, памералі ціск, далі рэкамендацыі.



— Людзі прывыкаюць да новай формы абслугоўвання, — заўважае Сяргей Лойка. — Магчыма, некаторым даспадобы стацыянарны ФАП, куды часам прыходзілі, проста каб пагаварыць. ФАП на колах па камплектацыі нічым не адрозніваецца ад стацыянарных. Разам са старастамі вёсак абмяркоўваем месцы прыпынку, каб людзям было зручна. Мяркуем рабіць некалькі прыпынкаў у вёсцы.

У Гродзенскай вобласці такія ФАПы пачалі раз'язджаць два гады таму. На Зэльвеншчыне падобны эксперымент стартаваў у канцы лістапада. Установлена перасовачная амбулаторыя на аснове аўтобуса ПАЗ. Лесвіца зроблена такім чынам, каб было зручна заходзіць сталым людзям. У аўтобусе тры пакоі, у тым ліку працэдурны кабінет, ёсць кушэтка для тых, хто чакае сваёй чаргі.

Мабільны медыцынскі пункт абышоўся раённаму бюджэту ў 180 тысяч рублёў. Гэта нямала, але ён замяняе сем вясковых ФАПаў. Такая аптымізацыя, на думку яе аўтараў, дазволіць набыць сучаснае медыцынскае абсталяванне для камплектацыі цэнтральнай раённай бальніцы.

Дарэчы, ФАП на колах прадугледжвае выезды вузкіх спецыялістаў у рамках дыспансерызацыі насельніцтва. Згодна з графікам будуць вызначацца і катэгорыі насельніцтва. Пры неабходнасці прывязуць пераносны апарат для ультрагукавых даследаванняў.

— Магчыма, у рамках дыспансерызацыі ФАП і пульмаскан будуць ездзіць разам, і людзі змогуць прайсці медыцынскі агляд літаральна каля дома, што вельмі зручна, асабліва для сталых людзей, якіх цяпер большасць у вёсках, — адзначыў Сяргей Лойка. — Цяпер прыпынак доўжыцца ад трыццаці хвілін да паўтары гадзіны. Маршрут перасовачнага медыцынскага пункта будзем карэкціраваць. Не выключана, што ён будзе звязаны з прыездам аўтакрамы.

Пакуль новы медыцынскі комплекс не мае спецыяльных знакаў. Гэта проста белы аўтобус. Некаторыя жыхары часам блытаюць яго з аўталаўкай. Таму ў хуткім часе ён будзе пазначаны адпаведным лагатыпам, каб здалёк было відаць, што едзе медыцынская дапамога.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

Надвор'е

# ДА НАС ІДЗЕ АРКТЫЧНЫ ХОЛАД

## У ЧАЦВЕР ТЭМПЕРАТУРА ПАВЕТРА АПУСЦІЦЦА ДА МІНУС 23 ГРАДУСАЎ

**Учора мы назіралі рэзкую змену надвор'я. Калі раніцай фіксавалі ад нуля да мінус 5 градусаў, то ўжо ў сярэдзіне дня па краіне было 3—10 марозу. І ў далейшым будзе марозна, на большай частцы тэрыторыі пройдзе кароткачасовы снег, месцамі завеі, на асобных участках дарог галалёдзіца, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

І гэта правільна, што ў самы кароткі дзень у годзе (21 снежня), у дзень зімовага сонцастаяння, будзе дастаткова холадна. Уначы месцамі, а ўдзень у многіх раёнах пройдзе невялікі снег. Крыху павялічыцца снежны полаг. Зараз ён складае 1—5 сантыметраў, чакаецца 3—8 сантыметраў. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Вецер паўночны, паўночна-заходні, уначы парывісты, удзень умераны. Дзённая тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 4 градусаў па паўднёвым захадзе да мінус 12 градусаў па паўночным усходзе краіны. Атмасферны ціск будзе расці, а значыць, наперадзе чакаецца ўзмацненне марозаў і сонечнае надвор'е.

У сярэдзіне тыдня ўмовы надвор'я ў краіне будуць вызначаць халодныя паветраныя масы, якія паступаюць з поўначы Еўропы. У сераду чакаецца воблачна з праясненнямі. Месцамі пройдзе кароткачасовы снег, на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўночна-заходні умераны. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны — 10—17 марозу, пры праясненнях — да мінус 18—20 градусаў. Удзень тэмпература паветра складзе мінус 7—13 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах маразы слабейшыя: уначы — 7—9, удзень — 3—6 градусаў са знакам мінус.

Яшчэ адзін досыць марозны дзень будзе ў гэты чацвер. Кароткачасовыя снегапады чакаюцца ўначы па паўднёвым захадзе, а ўдзень месцамі па краіне. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўночна-заходні, заходні ўмераны. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе мінус 11—18 градусаў, пры праясненнях — 19—23 марозу, у дзённыя гадзіны слупкі тэрмометра пакажуць 7—13 градусаў ніжэй за нуль. У паўднёва-заходніх раёнах гэтай ноччу будзе мінус 7—10 градусаў, удзень — 2—6 градусаў ніжэй за нуль.

Але арктычнае надвор'е будзе «кіраваць» у нас нядоўга. Ужо ў пятніцу сітуацыя пачне мяняцца. Тэмпература паветра ўначы будзе мінус 8—15 градусаў, па ўсходзе пры праясненнях — да 16—18 марозу. Удзень тэмпература паветра складзе 1—7 марозу, у паўднёва-заходніх раёнах краіны ўначы мінус 4—7 градусаў, а ўдзень тут ужо чакаецца адліга пры тэмпературы нуль — плюс 3 градусы.

Як адзначаюць айчынныя сіноптыкі ў доўгатэрміновым прагнозе, ужо ў суботу ўдзень у нас усталюецца выдатнае слабамарознае надвор'е. У гэты дзень краіна яшчэ будзе знаходзіцца ў арбіце атлантычнага цыклону. Таму ўначы на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень месцамі пройдзе кароткачасовы снег, па поўдні — мокры снег з дажджом. У асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе 3—10 марозу, пры праясненнях да 13 градусаў ніжэй за нуль. Удзень тэмпература складзе да мінус 3—8 градусаў. У паўднёвых раёнах тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад мінус 2 да плюс 2 градусаў. Сіноптыкі лічаць, што ў нядзелю зноў падзьме вецер з поўначы Еўропы. Тэмпература паветра панізіцца да мінус 20 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Экспедыцыя з «зялёным поглядам»

### У Гродне адкрылася ландшафтная фотавыстаўка з відамі Гродзенскай пушчы

**Экспазіцыя стала вынікам дзвюх экспедыцый па рэспубліканскім заказніку ў Гродзенскім раёне. Красамоўныя фотаздымкі адлюстроўваюць прыгожыя мясціны адной з самых дзікіх экасістэм рэгіёна. З дапамогай прафесійных фатографаў можна ўбачыць унікальных жывёл у незвычайных ракурсах, кадры з вышыні птушынага палёту і дзіўныя атмасферныя пейзажы. Мяркуецца, што выстаўка ў рамках праекта «Зялёны погляд» працягне сваё падарожжа па краіне, і наступным адрасам стане Нацыянальная бібліятэка ў сталіцы.**



«Наша экспедыцыя зладжвалася ў першую чаргу ў турыстычных мэтах», — зазначае яе **арганізатар, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз» Сяргей КАЛЯДА.** Да ўдзелу ў водным сплаве былі прыцягнуты навукоўцы, інструктары, прафесійныя фатографы.

Па словах мастацтвазнаўцы Марыны Загідулінай, аўтары выстаўкі не толькі «схапілі» і перадалі нейкі кавалачак прыроды, але і знайшлі цікавы вобраз, каб данесці яго да гледачоў. Увогуле, стварылі храм прыроды, куды можна ўвайсці і духоўна ўзбагаціцца. Здаецца, што гэтыя здымкі ніколі не стомішся разглядаць. Між тым некаторыя фота зроблены, можна сказаць, у даволі экстрэмальных умовах, асабліва што датычыцца жывёльнага свету. Іншы раз папросту шанцавала сустрэць рэдкія віды птушак па ходу экспедыцыі.

Удзельнікі вандроўкі прайшлі за некалькі дзён на байдарках па водных артэрыях Гродзенскай пушчы больш за 30 кіламетраў. Гэтая тэрыторыя адметна тым, што ўваходзіць у зону Аўгустоўскага канала і стварае яго «залатое кола». У цэлым пераадолець водны маршрут няцяжка, кажуць удзельнікі. Гэта пад сілу нават навічкам. Справа ў тым, што глыбіня рачулак вакол канала невялікая — крыху больш за метр. Таму, нават калі байдарка перакулілася, можна спакойна выйсці на бераг альбо плыць далей.

Праўда, на выстаўцы тахіх фотафактаў не ўбачыш, затое можна даведацца аб асаблівасцях цудоўнага куточка прыроды. Па словах **заолага і краязнаўца Віталя ГУМЕННАГА,** у экспазіцыі прадстаўлена ўся багатая флора і фаўна рэспубліканскага заказніка. Напрыклад, аляпка — вадзяны верабей, чорны бусел, які занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Трапляліся на шляху гняздо вялікай чомгі, ці паганкі, — птушкі з хохлікам, якая возіць на спіне сваіх птушанят. На гэтай тэрыторыі можна ўбачыць чатыры віды чаек, два віды крачак, вялікую вып з сямейства чаплевых, драпежнікаў. Тут знаходзіцца адзінае ў рэгіёне гняздо чырвонага каршуна.

На адным з фота Віталь Гуменны нешта паказвае астатнім удзельнікам экспедыцыі. Аказваецца, гэта мясцовасць цікавая і сваёй гісторыяй — тут самы чысты куток рэгіёна, які быў часткай Паазёрскага ледніка. Менавіта паслялedniковая раўніна, па словах навукоўца, дае такую разнастайнасць рэдкіх рыб і птушак.

Безумоўна, цікавасць у турыстаў павінна выклікаць звілістая рака Асташанка. Гэта асабліва добра відаць на здымках з дрона, якія ахопліваюць з вышыні Аўгустоўскае кальцо. Усе маршруты гэтай тэрыторыі складаюць каля 300 кіламетраў. Па словах Сяргея Каляды, такія здымкі — сапраўдны падарунак для турыстаў. Да таго ж і дапамога інструктарам, якія могуць не толькі расказаць пра канкрэтны маршрут альбо паказаць на карце, але і паказаць яго пэўны выгляд.

— Мы прыйшлі да высновы, што ў нас вельмі мала добрых, цікавых фотаздымкаў, ролікаў менавіта гэтых прыродных мясцін. Экспедыцыя якраз і запоўніла гэту нішу, — лічыць арганізатар. — Маршруты па Аўгустоўскім кальцы будуць цікавыя таксама аматарам веларуху. Магчыма, мы зладзім і такую экспедыцыю. У спартыўнага саюза ёсць пэўная інвентарная база, у тым ліку тандэм і нават трохколавы ровар для дарослых.

Суразмоўца лічыць, што ў хуткім часе пачнецца барацьба за турыста. Таму варта паказаць як мага больш фота- і відэафактаў аб асаблівасцях рэгіёна. У хуткім часе ўвесь матэрыял экспедыцыі будзе апрацаваны і распаўсюджаны ў сацыяльных сетках ці інтэрнэт-каналах пад брэндам «Гродзенская пушча. Беларусь». Таксама плануецца выпуск фотаальбома.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара**

# Шэрагі акадэмікаў папоўніліся...

### НАН Беларусі падвяла вынікі выбараў новых акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў

**Выбары адбыліся падчас сесіі Агульнага сходу НАН Беларусі 17 снежня 2021 года.**
**На 23 вакансіі акадэмікаў і 27 вакансій членаў-карэспандэнтаў прэтэндавалі 30 і 57 кандыдатаў адпаведна.**

Самы вялікі конкурс адзначаны сярод кандыдатаў на званне акадэміка па спецыяльнасці «Матэрыялазнаўства ў машынабудаванні» (тры чалавекі на месца). Сярод кандыдатаў на званне члена-карэспандэнта найбольш прэтэндэнтаў было па спецыяльнасці «Матэрыялазнаўства» (дзевяць чалавек на месца).

У выніку тайнага галасавання абрана 19 сапраўдных членаў (акадэмікаў) і 16 членаў-карэспандэнтаў.

Акадэмікамі сталі аўтарытэтныя вучоныя, лідары навуковых напрамкаў. Сярод іх Эмілія Каламіец, дырэктар ДНВА «Хімічны сінтэз і біятэхналогіі», дырэктар Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі; Аляксандр Каваленя, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі; Фёдар Прывалаў, генеральны дырэктар Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве; Анатоль Кулак, дырэктар Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі НАН Беларусі. Шэрагі акадэмікаў папоўнілі таксама вядомыя вучоныя-медыкі, у тым ліку Алег Румо, дырэктар Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, трансплантологіі і гематалогіі; Сяргей Красны, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі; Леанід Цітоў, загадчык лабараторыі РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі.

Сярод 16 абраных членаў-карэспандэнтаў — Андрэй Іванец, галоўны вучоны сакратар НАН Беларусі; Сяргей Губкін, дырэктар Інстытута фізіялогіі НАН Беларусі; Андрэй Піліпук, дырэктар Інстытута сістэмных даследаванняў у АПК НАН Беларусі; Мікалай Куляшоў, загадчык кафедры Беларускага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта; Сяргей Рубнікавіч, рэктар Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта; Ігар Карпаў, загадчык кафедры Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

У сесіі Агульнага сходу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прыняло ўдзел каля трохсот прадстаўнікоў акадэмічнай, вузаўскай, галіновай навукі, члены Прэзідыума НАН Беларусі, вышэйшыя службовыя асобы, прадстаўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, вядучыя вучоныя краіны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-140706 (назначение – здание одноквартирного жилого лома, наименование – жилой дом), площадью 67,2 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Путришковский с/с, д. Заболоть, 13а.**

ЛОТ 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 422088002701000050 (назначение – земельный участок для обслуживания одноквартирного жилого дома), площадью 0,2500 га по адресу: Гродненский р-н, Путришковский с/с, д. Заболоть, 13а. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 522, площадью 0,0144 га; земельные участки, расположенные в пределах территории перспективного развития населенного пункта, код – 11, площадью 0,2500 га.
Начальная цена продажи: 50 000 руб. (пятьдесят тысяч рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 5 000 (пять тысяч рублей)

Продавец – учебно-опытный сельскохозяйственный производственный кооператив «Путришки», 231750, Гродненский р-н, аг. Путришки, ул. Тарханова, 49, тел./факс 8-0152-715-166

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833 225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 06 января 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 20.10.2021 г.

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 04 января 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion**



**ГАЙНЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ** (организатор аукциона)
**извещает о проведении 21 января 2022 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **аг. Корень, ул. Северная, У-13Б,** кадастровый номер 623280805101000163, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,1302 | Газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение | 5000,00 | 1000,00 | 1912,79 + расходы за размещение объявления |
| 2 | **д. Беланы, ул. Березовая, 15 (У-1),** кадастровый номер 623280811301000075, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,1495 | Электроснабжение | 6000,00 | 1200,00 | 2175,83 + расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона:** 21.01.2022 в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Логоза, ул. Центральная, д. 2, Гайненский сельский исполнительный комитет, конт. тел.: (801774) 53927, 53957, 53938; (+37529) 1283467.

**Прием документов, ознакомление с участком и документацией:** ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 17.01.2022 включительно.

**Для участия в аукционе необходимо:**
1) подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов;
2) представить квитанцию об оплате суммы задатка;
3) представить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;
4) заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Задаток** перечисляется на расчетный счет № BY60AKBB360061902 11080000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X г. Минск, код 795, ОКПО 04431493, УНН 600537220, Гайненский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

**Условия:** аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Продавец, Организатор аукциона) информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды сроком на пять лет помещений, находящихся в изолированном помещении, с инв. № 500/D-708150733, расположенном по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 34-2:**

**Лот № 1: кабинет № 2-53 (17,0 м²).** Начальная цена с НДС – 71,83 руб.
**Лот № 2: кабинет № 2-52 (16,2 м²).** Начальная цена с НДС – 68,45 руб.
**Лот № 3, состав: 1. кабинет № 2-36 (33,9 м²); 2. кабинет № 2-35 (16,6 м²).** Начальная цена с НДС – 213,37 руб.
**Лот № 4, состав: 1. кабинет № 2-18 (15,8 м²); 2. кабинет № 2-19 (16,7 м²).** Начальная цена с НДС – 137,32 руб.

**Аукцион состоится 12.01.2022 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by** и Организатора аукциона **ino.by.**

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

Будзьце пільнымі

# КРЭДЫТ НА ДАВЕР

**Што адбываецца, калі сцэнарый таварна-грашовых адносін адзін з бакоў перапісвае пад сябе? У тую яшчэ гісторыю патрапілі гамяльчане: прайшлі ўсе стадыі адстойвання сваіх правоў спажыўца, выйгралі суды, але так і не вярнулі пакуль свае кроўныя і ўсё ж працягваюць змагацца. Як высветлілася, у ашуканых людзей адна гісторыя на ўсіх. Яны звярнуліся да аднаго і таго ж прадпрымальніка па аказанні рытуальных паслуг.**

## АПОШНІЯ «ПАХАВАЛЬНЫЯ»

Усё як пад капірку: знайшлі фірму па станоўчых водгуках аб паслузе, склалі афіцыйны дагавор, унеслі задатак, чакалі выканання работ. Нават пасля зрываў тэрмінаў заказу спрабавалі выбудаваць адносіны з выканаўцам па-мірнаму. Складалі дадатковыя дагаворы і зноў чакалі...

Пра тое, у якое нязручнае становішча гэтая гісторыя паставіла яе перад сваякамі, расказала адна з тых самых ашуканых спажыўцоў гамяльчанка Алена Уладзіміраўна:

— Раней рабіла заказ на выраб помніка ў гэтага ж прадпрымальніка, мяне ўсё вельмі задаволіла. Таму гэтай вясной, калі вырашылі са сваякамі сабрацца і заказаць надмагілле на магілку бабулі, добраўпарадкаваць пліткай пляцоўку ўнутры агароджы, я сказала: «Давайце да яго звернемся». Дала задатак — тысячу рублёў. Ён не выконваў нічога. Тэлефанавала, чакала, потым прыйшла да яго на фірму, казаў: «Увайдзіце ў становішча, праблемы з пастаўшчыкамі». Я пагадзілася, мы заключылі дадатковы дагавор, пасля гэтага ён на сувязь не выходзіў, з арандаванага офіса з'ехаў, я прыходзіла туды неаднаразова, усё безвынікова.

Так, у канцы жніўня Алена Уладзіміраўна апынулася ў гарадской арганізацыі «Беларускае таварыства абароны спажыўцоў». З дапамогай юрыста склалі іскавую заяву аб скасаванні дагавора куплі-продажу з прадпрымальнікам, вяртанні авансу за паслугу. На пасяджэнне ў суд адказчык не з'явіўся. Было вынесена завочнае рашэнне. Па ім прадпрымальнік абавязаны вярнуць выплачаную тысячу рублёў, выплаціць няўстойку за больш чым 100 дзён зрыву тэрміну заказу і 200 рублёў кампенсацыі прычыненай маральнай шкоды.

— Я напісала і заяву ў міліцыю на гэтага грамадзяніна. Мне сказалі, што я ўжо такая сёмая — давала паказанні, — удакладняе гамяльчанка. — Цяпер перад сваякамі маімі вельмі няёмка, таму што цяпер зноў трэба збіраць грошы, каб прывесці ўсё ў парадак на магілках, як мы і планавалі.

На працягу аднаго вераснёўскага тыдня ў гарадскую арганізацыю «Беларускае таварыства абароны спажыўцоў» звярнуліся тры чалавекі, якія прасілі прадстаўляць іх інтарэсы ў судзе ў дачыненні да аднаго і таго ж індывідуальнага прадпрымальніка. Адна з гамяльчанак зрабіла заказ на выраб помніка нестандартнай формы і добраўпарадкаванне месца пахавання амаль на пяць з паловай тысячы рублёў, таксама ўнесла аванс. Толькі праз суд спажывец дабілася скасавання дагавора куплі-продажу. Па рашэнні суда адказчык павінен быў выплаціць ёй 1050 рублёў, столькі ж грошай — і ў мясцовы бюджэт.

## ДУМАЎ, КАБ ХУТЧЭЙ

Адзін з ашуканых спажыўцоў Аляксей (прасіў не ўказваць прозвішча) распавёў, што ўжо з гэтым жа адказчыкам дайшоў да суда, пагадзіўся падпісаць міравое пагадненне і прыпыніць справу, але словам прадпрымальніка аказалася грош цана:

— У чэрвені заключыў дагавор на ўстаноўку надмагілля для майго бацькі: якраз набліжалася гадавіна. Мне гэтую фірму падказалі знаёмыя, якія раней звярталіся туды, засталіся вельмі задаволеныя. Я загадзя пацікавіўся, колькі передаплаты ўносяць звычайна перад заказам, мне сказалі 10—15 % ад кошту. Але тут, падумаў, рэкамендавалі ўсё ж такі праверанага чалавека. На фірме сказалі: даражэюць матэрыялы — калі хочаце, каб было хутчэй, унясіце 50 % грошай наперад. Я пагадзіўся, аплаціў паўтары тысячы рублёў.

Калі ж прадпрымальнік «зарэзаў» усе тэрміны, на кантакт не выходзіў, гамяльчанін вырашыў звярнуцца да праваахоўнікаў. Паралельна, расказвае Аляксей, звярнуўся да юрыста ў таварыства па абароне правоў спажыўцоў:

— Калі я прыйшоў пісаць заяву ў міліцыю, мне сказалі, што я такі ўжо чацвёрты, але заяву прынялі. У таварыстве па абароне правоў спажыўцоў склалі іскавую заяву. На першае пасяджэнне ў суд прадпрымальнік прыйшоў, растлумачыў, што гатовы выканаць заказ у найбліжэйшы час. Запэўніваў, што ў яго няма больш даўгоў перад іншымі спажыўцамі, зможа, маўляў, выправіць становішча за месяц — дайце толькі час. Суддзя прапанаваў нам падпісаць міравое пагадненне. Я пагадзіўся прыпыніць справу і даць яму месяц адтэрміноўкі. Праз месяц на новае слуханне ён ужо не з'явіўся, на сувязь перастаў выходзіць, нічога не выканаў, што абяцаў. Тыдзень таму я быў у судовага выканаўцы, спадзяюся, справа зрушыцца з мёртвай кропкі.

## ЧАСАМ ДАВОДЗІЦЦА ЧАКАЦЬ ГАДАМІ

У рабоце са спажыўцамі дзясяткі гісторый пра вытрапаныя нервы ў судовых звадах, але, каб дачакацца вяртання «сваіх кроўных», трэба набрацца цярпення.

— Часам даводзіцца чакаць гадамі, — дзеліцца **юрысконсульт Гомельскай гарадской арганізацыі ГА «Беларускае таварыства абароны спажыўцоў» Андрэй БАБІЧ**.

Індывідуальны прадпрымальнік можа аказацца банкрутам, без маёмасці ва ўласнасці, якую можна забраць за даўгі. Калі прэтэндэнтаў на выплату па гэтых самых даўгах шмат, ёсць не пагашаныя пазыкі перад банкамі, то чакаць вяртання сваіх грошай спажыўцы могуць вельмі доўга.

— Даволі дзейсныя меры ў падобных гісторыях — падача заявы ў суд і ўпраўленні юстыцыі аб забароне на выезд за межы краіны, на кіраванне транспартным сродкам. Часта вельмі актуальнай з'яўляецца забарона на наведванне ігральных устаноў, таму што даўжнікі могуць быць наўпрост гульнянаманамі, — тлумачыць Андрэй Іванавіч.

Ён і прадстаўляў у судзе інтарэсы спажыўцоў, якія заказвалі выраб надмагілляў у аднаго і таго ж прадпрымальніка. Юрыст падкрэслівае, што заўжды рэкамендуе сваім кліентам пісаць заяву ў міліцыю.

— Ніколі не выключайце, што вы, магчыма, соты ашуканы спажывец. Калі людзі думаюць, што не трэба звяртацца да праваахоўнікаў, ці ўвогуле спрабуюць самастойна знайсці выйсце з цяжкай спажывецкай сітуацыі, яны толькі зацягваюць і ўскладняюць працэс.

## НЕ СУДОМ АДЗІНЫМ

Між тым, калі ашуканы спажывец не мае магчымасці звярнуцца па кансультацыю да юрыста Беларускага таварыства абароны спажыўцоў, ён можа скарыстацца законным правам атрымаць у гэтым пытанні падтрымку мясцовых выканаўчых органаў па месцы рэгістрацыі юрыдычнай асобы або індывідуальнага прадпрымальніка.

Напрыклад, на Гомельшчыне працуюць 23 упаўнаважаныя па абароне правоў спажыўцоў Гомельскага абласнога, гарадскога і раённых выканаўчых камітэтаў. Яны разглядаюць звароты па першай інстанцыі ў дасудовым парадку. Судовае ўмяшанне павінна быць, хутчэй, выключэннем — гэта правіла, да якога імкнуцца ў падобнай рабоце з насельніцтвам.

## ЗАГУЛЯЎСЯ Ў БІЗНЕС ДА «КРЫМІНАЛКІ»

Юрысты і спецыялісты, што займаюцца абаронай правоў спажыўцоў на Гомельшчыне, абмяркоўваюць паказальны «спажывецкі прэцэдэнт».

Следчым упраўленнем УСК па Гомельскай вобласці завершана расследаванне крымінальнай справы аб завалодванні грашыма заказчыкаў корпуснай мэблі. Па версіі следства, дырэктар і галоўны бухгалтар адной з фірмаў на працягу некалькіх гадоў добрасумленна аказвалі паслугі па вырабе і ўстаноўцы мэблі. Праз некаторы час якасць іх паслуг знізілася — сталі зацягвацца тэрміны вырабу мэблі, з'явіліся пазыковыя абавязкі перад заказчыкамі і страты дзелавой рэпутацыі.

У 2019 годзе з-за праблем з фінансамі прадпрымальнікі па тым жа адрасе адкрылі аналагічную фірму пад іншай назвай. Заключалі з грамадзянамі на ўмовах перадаплаты дагаворы на выраб і рэалізацыю корпуснай мэблі, матрацаў. Памер перадаплаты складаў ад 70 да 100 % ад кошту замовы. Большасць кліентаў цалкам аплачвалі заказ у дзень заключэння дагавора. Часцяком грамадзяне пераводзілі на рахунак арганізацыі грашовыя сродкі, узятыя ў крэдыт. Бізнесмены ажыццяўлялі сваю дзейнасць па прынцыпе «пірамiды»: за кошт паступлення грошай ад новых кліентаў выраблялі мэблю па старых дагаворах. Тэрміны аказання паслуг, як правіла, не выконваліся. Абяцаныя шэрагу кліентаў адзін-тры месяцы на выраб канапы ці кухні зацягнуліся на паўтара-два гады безвынiковага чакання. Ашуканыя заказчыкі сталі звяртацца з заявамі ў розныя інстанцыі. У выніку пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу.

— Следчым упраўленнем УСК па Гомельскай вобласці абагульнены і вывучаны шматлікія факты супрацьпраўнай дзейнасці фігурантаў. Яны заключалі фіктыўныя дагаворы, загадзя не маючы намеру выконваць прынятыя на сябе абавязацельствы, атрымлівалі перадаплату і завалодвалі грашыма кліентаў. Устаноўлена, што з кастрычніка 2018-га да снежня 2020 года абвінавачаныя ашуканскім шляхам завалодалі грашовымі сродкамі 28 грамадзян на агульную суму больш за 71 тысячу рублёў. Большасць пацярпелых — жыхары Гомеля, — удакладніла **афіцыйны прадстаўнік УСК па Гомельскай вобласці Марыя КРЫВАНОГАВА**.

Да абвінавачаных прымянена мера стрымання ў выглядзе асабістага паручыцельства. Крымінальная справа вывучана пракурорам і накіравана для разгляду ў суд.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Камунальныя стасункі

# Бяспечная вадзіца ў кране і крыніцы

**Беларус спажывае за суткі ў сярэднім 120 літраў вады, а яе запасы і магчымасці здабычы з нетраў ацэньваюцца і прагназуюцца спецыялістамі на 25-30 гадоў наперад. У планах на 2021–2025 гг., прадугледжаных у межах падпраграмы «Чыстая вада», у Беларусі збіраюцца збудаваць каля 800 станцый абезжалезвання і 300 водазаборных свідравін, перападключыць звыш 100 населеных пунктаў да існуючых цэнтралізаваных сістэм з вадой пітной якасці, забяспечыць усю сталіцу вадой з падземных крыніц. Такія задачы агучылі эксперты, якія расказалі пра якасць пітной вады ў краіне.**



Сярод галоўных задач падпраграмы — забеспячэнне жыхароў вадой пітной якасці і цэнтралізаванымі сістэмамі водазабеспячэння і водаадвядзення, павышэнне якасці ачысткі сцёкавых вод і надзейнасці сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення, агучыла **Ірына РОЎБА, намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белводаканал»**:

— *Прадугледжаны будаўніцтва, рэканструкцыя і мадэрнізацыя больш як 70 аб'ектаў ачышчальных збудаванняў сцёкавых вод для павышэння іх якасці. А таксама развіццё цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення праз будаўніцтва размеркавальных сетак. Акрамя таго, штогод мяркуецца мяняць больш як 3 % сетак са звышнарматыўнымі тэрмінамі эксплуатацыі.*

На гэты год, напрыклад, запланавана будаўніцтва 195 станцый абезжалезвання, 80 % з якіх ужо гатовыя, а 48 % — увядуць да канца года. Такія мерапрыемствы ўжо сёлета дазволяць забяспечыць якаснай пітной вадой 95,8 % жыхароў, а цэнтралізаваныя сістэмы водазабеспячэння мае ўжо 91 % насельніцтва, падкрэсліла спецыяліст. Гадавое заданне па забеспячэнні беларусаў якаснай пітной вадой сёлета, дарэчы, перавыканалі на Віцебшчыне і Гродзеншчыне.

Штодня Мінск ужывае 450 тысяч м³ вады, якую здабываюць як у горадзе, так і за яго межамі. Асаблівасць сталічнай сістэмы водазабеспячэння ў тым, што тут існуюць дзве крыніцы водазабеспячэння: 11 аб'ектаў водазабору, якія здабываюць ваду з падземных крыніц, і ачышчальная водаправодная станцыя, якая выкарыстоўвае ваду з паверхневай крыніцы, расказаў **Антон ГАЛАСКОК, начальнік вытворчасці «Мінскводаправод»**:

— *За год выконваецца каля 50 тысяч даследаванняў вады. Яе якасць кантралюецца на ўсіх этапах шляху да спажыўца: здабычы з крыніц, падрыхтоўкі на водазаборах і падачы ў размеркавальныя сеткі. Акрамя таго, у пяці лабараторыях на станцыях кантралююцца яшчэ і тэхналагічныя працэсы.*

Якасць водаправоднай вады па хімічным складзе і яе мікрабіялагічных характарыстыках вызначаецца пастаянствам і высокім узроўнем бяспекі, адзначаюць спецыялісты. Акрамя водаправоднай, планава даследуецца і вада з пітных калонак і разнастайных фантанчыкаў — з іх дапамогай можна спакойна наталіць смагу. Што ж датычыцца крыніц, якасць вады ў іх не вывучаюць.

— *На вока вада можа выглядаць чыстай, аднак што яна ў сабе ўтрымлівае — пытанне. Усё залежыць ад месца, дзе крыніца б'е, што на яе ўплывае звонку. І адна справа — месцы, дзе існуюць арганізаваныя крыніцы, і зусім іншая — крыніца, што разліваецца сама: трэба некалькі разоў падумаць, ці варта з яе піць,* — адзначыла Ірына Роўба.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

# ВІНШАВАННЕ: АЎТАРСКІ ФАРМАТ

## У Магілёве падвялі вынікі конкурсу пэфак — 2022

**Пэфкі — гэта невялічкія аўтарскія навагоднія фотавіншаванні. Традыцыя даўняя, але адрадзілі яе ў Магілёве менавіта фотамастакі. У апошнія гады народны фотаклуб «Вясёлка» напярэдадні зімовых свят праводзіць спаборніцтвы сярод аматараў гэтага майстэрства.**

Магілёўская фотамастачка Ірына Савосіна — адна з самых актыўных арганізатараў конкурсу, разам з кіраўніком клуба Анатолем Талкачовым стаяла каля вытокаў яго адраджэння.

— Конкурс напярэдадні 50-годдзя клуба «Вясёлка» атрымаўся самы маштабны, — кажа яна. — У ім прыняло ўдзел каля 30 аўтараў з Беларусі, Чэхіі, Расіі. Самаму малодшаму ўдзельніку ўсяго 4 гады, а самаму ўзроставаму — 81. Барацьба за перамогу была вельмі жорсткая. І яе яшчэ больш ажывіў удзел прафесійных мастакоў — Веры Юрковай і Святланы Строгінай, якія падзяліліся сваімі рэпрадукцыямі. У Магілёве такое адбылося ўпершыню, удзел мастакоў у фотаконкурсе наогул — вялікая рэдкасць. Раней у нас сустракаліся такія работы, але іх было няшмат. Да таго ж звычайна мастакі малююць нешта ад рукі, а мы ўзялі невялічкія рэпрадукцыі.

Свае работы Ірына зрабіла гэтым разам у стылі рэтра — на кардоне, як гэта было модна ў пачатку ХХ стагоддзя. І з надпісам — «50 гадоў клубу «Вясёлка» на адваротным баку.

На конкурсе можна было ўбачыць у тым ліку і архіўныя работы. Напрыклад, Лукі Маразевіча. Ён рабіў яе на 10-годдзе фотаклуба «Вясёлка» ў 1982-м годзе. За аснову ўзяў навагоднюю паштоўку і замяніў твар Дзеда Мароза на свой.



Пераможцай конкурсу PF — 2022 стала Ірына ГЛАДКІХ.

Сярод навічкоў прысутнічаў Валерый Маскалёў, які ўдзельнічаў у конкурсе ўпершыню, хоць шмат што чуў пра яго ад сваіх сяброў-фатографаў.

— Мой здымак увайшоў у дзясятку найлепшых, і для першага разу, лічу, гэта класна, — усміхаецца ён.

Наталля Кавалеўская прынесла на конкурс фота свайго бацькі Сяргея Кавалеўскага і адразу ж захапілася ідэяй. Яна сама таксама здымае, прычым прафесійнай камерай на плёнку. Яе прыярытэты — партрэты людзей і жывёл. Яна яшчэ школьніца, марыць паступіць у Санкт-Пецярбургскі ўніверсітэт. А цяпер у яе з'явілася яшчэ адна мэта — падрыхтаваць што-небудзь арыгінальнае да наступнага конкурсу.

Мікалай Хацяінцаў — пастаянны ўдзельнік конкурсу пэфак. Лічыць, што конкурс набірае абароты і ў яго добрая будучыня.

— Вельмі радуе, што з'явіліся новыя аўтары, якія прынялі актыўны ўдзел у нашым конкурсе навагодніх паштовак, — кажа ён. — Гэта сведчыць, што конкурс цікавы не толькі прафесійным фатографам. Нездарма, нягледзячы на пандэмію, прыйшло так шмат людзей. Творчасць аб'ядноўвае нават у такі складаны час.

Прыемна паведаміць, што на гэты раз карэспандэнт газеты «Звязда» Нэлі Зігуля са сваёй работай «Пантонны мост праз раку Сож у Слаўгарадзе» падзяліла другое месца з вядомым магілёўскім фотамастаком Генадзем Карчэўскім. А пераможцам конкурсу пэфак — 2022 стала новы член народнага клуба «Вясёлка» Ірына Гладкіх з Масквы. Яе выстава якраз прайшла ў фотаклубе ў лістападзе.

— Работы Ірыны Гладкіх мяне ўразілі, — прызналася мастачка Вера Юркова. — Вельмі цікавы аўтар.

**Кіраўнік народнага клуба «Вясёлка» Анатоль ТАЛКАЧОЎ** прызнаўся, што яму вельмі імпануе такая цікавасць да конкурсу.

— Самае галоўнае ў стварэнні пэфкі — творчы падыход. І чым больш у нас будзе ўдзельнікаў, тым больш цікавым і арыгінальным атрымаецца вынік.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота Ірыны САВОСІНАЙ.**

# З анёлам-ахоўнікам, казачным Дзедам і новым аўтобусам

### У Брэсце зладзілі святочнае шоу з нагоды адкрыцця навагодняй ёлкі

**На свята адкрыцця галоўнай ёлкі Брэста сабралася шмат гараджан. Ішлі ў асноўным сем'ямі, не спалохаліся нават дробнага дажджу, што імжыў з перапынкамі, нібы пасмейваючыся з удзельнікаў імпрэзы. Але да шасці вечара, калі праграма распачалася, дождж сцішыўся зусім, як і не было.**

Свята пачалося з вясёлай, дынамічнай тэатралізаванай праграмы, галоўнай інтрыгай якой арганізатары зрабілі перамогу дабра над злом. Цёмныя сілы не давалі Дзеду Марозу са Снягуркай дабрацца да ёлкі. Чаго толькі не прыдумвала пошасць, як не вывірочваліся істоты ў чорных балахонах, але на ўсе іх кпіны і здзекі знаходзіўся адказ. З'явіўся велічны анёл-ахоўнік Брэста і разагнаў гэтых пачвар, зняў злыя чары — абудзіў ад сну Дзеда Мароза і Снягурку. Тэатральная дзея, якая разгортвалася з прымяненнем высокіх тэхналогій, склала цікавае відовішча. Усё трансліравалася на вялікі экран для зручнасці тых, хто стаяў далей ад сцэны. І калі казачны Дзед са сваёй чароўнай унучкай нарэшце вырваліся з лап злых чараўнікоў і пад заклікі вядучага заспяшаліся



па вуліцы горада на брэсцкую ёлку, малы, што стаяў побач з намі, гучна звярнуўся да сваіх бацькоў: «А чаму Дзядуля Мароз да нас не на аленях спяшаецца, а на «Яндэкс-таксі» едзе?» Але бацька знайшоўся: «Таму што снегу няма ў Брэсце, як жа ён на санях прыехаў бы? Спазніўся б, ёлку без яго не запалілі б».

І вось нарэшце героі дабраліся, анёл-ахоўнік са сваімі памагатымі закружыўся ў віхуры танца ў знак перамогі светлага, чыстага над чорным і злым. Адпаведны настрой быў зададзены, і на сцэне — у белым — паявілася галоўная госця свята — заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Ірына Дарафеева.

Разам са старшынёй гарвыканкама Аляксандрам РАГАЧУКОМ яна запаліла галоўную брэсцкую ёлку. Спявачка выканала для аўдыторыі некалькі хітоў, знаёмых і любімых.

Мэр горада цёпла павіншаваў гараджан і гасцей горада з надыходзячымі святамі, выказаў упэўненасць, што год будзе ўдалы для ўсіх нас. Кіраўнік Брэста асабліва падзякаваў медыкам, якія лечаць; будаўнікам, што ўпрыгожваюць і паляпшаюць горад; настаўнікам, работнікам вытворчай сферы — усім, хто штодня шчыруе на карысць горада і яго жыхароў.

Таксама ў гэты дзень непасрэдна каля ёлкі адбылася яшчэ адна знакавая падзея — прэзентацыя аўтобуса № 77. Гэта першы ў Брэсце гарадскі маршрут, які звяжа абласны цэнтр з горадам-спадарожнікам Жабінкай. Пры гэтым заехаць у райцэнтр можна за 70 капеек: менавіта столькі каштуе цяпер праезд у гарадскім транспарце Брэста. А нумар рэйса вызначалі галасаваннем. Раней мэр запусціў у сваім тэлеграм-канале апытанне з прапановай некалькіх нумароў. Напрыклад, ваша пакорная слуга галасавала за нумар 100 для згаданага аўтобуса. Але, як відаць,



большасцю галасоў маршрут атрымаў нумар 77. І адправіўся ў Жабінку проста з-пад ёлкі, з галоўнай плошчы абласнога цэнтра пад гукі аркестра.

Сама ж ёлка запалілася каляровымі агнямі з пажаданнямі шчасця і дабрабыту ў новым годзе. Яны засвяціліся неонавымі літарамі на стужках, што абвіваюць навагоднюю прыгажуню. Было шмат музыкі і песень. Для ўсіх ахвотных была даступная фотазона з разнастайнымі інсталяцыямі, побач працавалі атракцыёны. Цяпер ёлка кожны вечар будзе радаваць наведвальнікаў святочнай праграмай.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**



# Яшчэ не Новы



# ЁЛКА Ў СТЫЛІ «ЛОФТ»

## У Гродне з'явілася алея дызайнерскіх навагодніх прыгажунь ад арганізацый і прадпрыемстваў горада

**Штогод старажытны парк імя Жылібера дапаўняюць новыя дрэвы. Яны незвычайныя. І ўпрыгожваюць іх не зусім звыклымі цацкамі. Сёлета цудоўная алея «пабіла» ўсе рэкорды па колькасці дызайнерскіх ёлак.**

Сюды лепш прыходзіць вечарам, калі ўсе дрэўцы зіхацяць агеньчыкамі. Дарэчы, уключаюцца яны адначасова, а першая цырымонія прайшла ўрачыста і з вясёлымі забавамі. Народнымі песнямі сустрэў наведвальнікаў парку фальклорны гурт «Медуніца», які такім чынам прыцягваў увагу да ёлкі завода «Белкард».

Прадстаўнікамі адукацыі Ленінскага раёна створана ёлачка з драўляных элементаў, яна ўпрыгожана домікамі, дзе жывуць казачныя героі — так тут раскрываюць свет дзяцінства. Прадпрыемства «Гранітэкс» прадставіла ёлку з тэкстылю. Паўсюдна працуюць фотазоны і даволі шмат Дзядоў Марозаў, якія ахвотна пазіруюць каля зялёных прыгажунь. Заўважаю маладую сям'ю, што робіць фотаздымкі ля кожнай ёлкі. Цікаўлюся, як часта яны ходзяць на гарадскія святы. Аказалася, што амаль заўсёды, бо так нараджаецца добры настрой. А парк перад Новым годам — гэта сапраўдная казка, з захапленнем выказаўся іх сын Кірыл. Найбольш усяго яму спадабалася ёлка прадпрыемства «Малочны мір», бо «яна круціцца».

Вядома, не магла не запытаць у стваральнікаў ёлак пра іх задумкі. **Намеснік дырэктара «Гродзенскія цеплавыя сеткі» Андрэй СЯЎКО** патлумачыў, што яны адлюстравалі ў сваім творы ўсе віды энергетыкі рэгіёна. Тут і ГЭС, і ветракі, і атамная станцыя. Уся канструкцыя зроблена з перадізаляваных труб, якімі пракладваецца цеплатраса. Як аказалася, яны могуць «працаваць» і ў такім цікавым фармаце.

«Гроднаводаканал» прадставіў канструкцыю з труб з шарамі. А вось шклозавод зрабіў канструкцыю ў стылі «лофт». **Ганна КАРОЛЬ, вядучы інжынер па падрыхтоўцы кадраў,** звярнула ўвагу на стыль вырабу. Маўляў, гэта цяпер вельмі модна. І ліставое шкло, якое выпускае завод, выдатна выглядае з падсветкай. А гасцей тут сустракае Дзед Мароз, але не са Снягуркай, а з Бабай Ягой. Дзецям вельмі падабаецца з ёй фатаграфавацца.

Многія цікавяцца ёлкай, якую прадставіла тралейбуснае ўпраўленне. Па словах яго **дырэктара Віктара ШАРЭЙКІ,** усё зроблена з акцэнтам на спецыфіку прадпрыемства. Ёлка стаіць на тралейбусным коле, ствол — са штангаў, каркас — з кантактных правадоў, на ім замацаваны невялікія мадэлі ўсіх відаў тралейбусаў — ад самых першых да сучасных, з аўтаномным ходам. У Гродне такіх машын некалькі.





Усяго прадстаўлена каля 60 дызайнерскіх ёлак. Некаторыя арганізацыі ўдзельнічаюць у такім паказе ўпершыню. У іх ліку — Гродзенскі медыцынскі каледж, чыя ёлка ўвасабляе актуальную ідэю вакцынацыі. Ажыццявіла праект 114 група, навучэнцы якой рыхтавалі яго два тыдні. Пра гэта расказала **культарганізатар Арына АРЦЕМ'ЕВА.**

Навагодняя ёлка стала нагодай, каб распавесці аб спецыяльнасцях Гродзенскага гуманітарнага каледжа, які таксама ўдзельнічае ў конкурсе ўпершыню. Па словах **намесніка яго дырэктара Галіны ЛУК'ЯНАВАЙ**, большасць рэчаў зроблена ўручную ў майстэрні. Ёлка выглядае стыльна, хоць яна і невялікая па памеры. А вось ёлка ГрДУ імя Янкі Купалы мае кніжную тэматыку — яна складаецца з імітацый старажытных фаліянтаў. Побач знаходзіцца святочная фотазона.






Адкрываць такую алею напярэдадні Новага года стала ў Гродне добрай традыцыяй. Гэта яскравая падзея, сапраўдны брэнд горада.

— Такога няма больш нідзе, — адзначае **намеснік начальніка аддзела культуры гарвыканкама Галіна ЯРЭМІНОВІЧ.** — Сёлета прадстаўлена 57 ёлак, і гэта рэкорд, такой колькасці яшчэ не было. Да праекта далучыліся паліклінікі, установы адукацыі, некаторыя прадпрыемствы. Прадстаўлены не толькі ёлкі, але і цэлыя кампазіцыі і фотазоны. Іх прэзентацыі праходзяць з удзелам навагодніх персанажаў.

У конкурсе на найлепшую ёлку будуць вылучаны тры пераможцы, якіх абярэ камісія. Яшчэ адна ёлка будзе вылучана самімі гродзенцамі праз анлайн-галасаванне. Акрамя дыпломаў, сёлета пераможцы конкурсу ўпершыню атрымаюць памятныя падарункі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.**

# год, але...

**Хто мне адкажа, калі пачынаецца навагоднее свята? Кожны мяркуе па-свойму, але ж усе мы з цікавасцю гатовыя зазірнуць у тыя наступныя дні, якія ў календары гэтаму святу папярэднічаюць. Адны з нас сёння рыхтуюць падарункі, другія ўпрыгожваюць свой дом (а таксама плошчы і вуліцы), прыглядаюцца да ёлачных рынкаў... Адным словам, асалода прадчування свята ёсць у настроі кожнага.**

Я не памыліўся, калі з фотаапаратам у руках прайшоў па цэнтры Мінска з мэтай сфатаграфаваць, як выглядае сталіца ў апошнія снежаньскія дні. На вуліцах ужо ззяюць гірлянды, вабяць вока казачныя інсталяцыі, нават сярод пешаходаў сустракаюцца Дзяды Марозы і Снягуркі. Пабываў я на галоўнай пляцоўцы свята каля Палаца спорту, дзе уладкоўваюць месца для святочнага канцэрта. На Кастрычніцкай плошчы убачыў падрыхтоўку да «Каляднага кірмашу». У Верхнім горадзе падзівіўся, як спрытна ўзводзяць фантастычныя дэкарацыі «ёлкі-касмалёта», так будзе выглядаць комплекс сцэны для вядомых выканаўцаў.

Карацей, гледзячы на радасны настрой і святочныя перамены вакол нас, разумееш: навагоднее свята ўжо пачалося. Назірайце ж і адчувайце яго.

**Яўген ПЯСЕЦКІ,
фота аўтара.**



## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-4538 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад № 1 сельхозмашин и оборудования), общей площадью 1244,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, 73.**

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000011000280, площадью 2,5117 га (назначение – для обслуживания производственной территории), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, 73. Земельный участок является неделимым и на данном земельном участке расположены иные объекты, не подлежащие продаже. Оформление земельного участка будет производиться после приобретения объекта в порядке, предусмотренном законодательством Республики Беларусь.
Начальная цена продажи лота – 342 000 руб. (триста сорок две тысячи) с учетом НДС.
Сумма задатка – 34 200 руб. (тридцать четыре тысячи двести рублей)

**ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 420/С-4533 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – душевая), общей площадью 46,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, 73.**

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000011000280, площадью 2,5117 га (назначение – для обслуживания производственной территории), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, 73. Земельный участок является неделимым и на данном земельном участке расположены иные объекты, не подлежащие продаже. Оформление земельного участка будет производиться после приобретения объекта в порядке, предусмотренном законодательством Республики Беларусь.
Начальная цена продажи лота – 10 000 руб. (десять тысяч рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 1 000 руб. (одна тысяча рублей)

**ЛОТ 3: капитальное строение, инв. № 420/С-42257 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж), общей площадью 73,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, 73.**

Лот № 3 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000011000280, площадью 2,5117 га (назначение – для обслуживания производственной территории), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, 73. Земельный участок является неделимым и на данном земельном участке расположены иные объекты, не подлежащие продаже. Оформление земельного участка будет производиться после приобретения объекта в порядке, предусмотренном законодательством Республики Беларусь.
Начальная цена продажи лота – 20 000 руб. (двадцать тысяч рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 2 000 руб. (две тысячи рублей)

ЛОТ 4: капитальное строение, инв. № 420/С-4537 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад № 3 спецодежды и стройматериалов), обшей площадью 429,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, 73.
Лот № 4 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000011000280, площадью 2,5117 га (назначение – для обслуживания производственной территории), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, 73. Земельный участок является неделимым и на данном земельном участке расположены иные объекты, не подлежащие продаже. Оформление земельного участка будет производиться после приобретения объекта в порядке, предусмотренном законодательством Республики Беларусь.
Начальная цена продажи лота – 126 900 руб. (сто двадцать шесть тысяч девятьсот рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 12 690 руб. (двенадцать тысяч шестьсот девяносто рублей)

Продавец – ОАО «Лида-агротехсервис», 231300, г. Лида, ул. Фурманова, 17, тел. 8-0154-61-14-39

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001 01 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 31 декабря 2021 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grino.by/aukcion

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

**Последний день приема заявлений – 29 декабря 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация http://grino.by**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества СЗАО «ЛадаГарант»

| Лот | Наименование лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона с учетом НДС 20 %, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение – административное помещение, назначение – административное помещение, с инв. 500/D-708055125, общей площадью 43,8 кв. м | 115 560,00 | 11 556,00 | 5 778,00 |

Лот № 1 находится в капитальном строении, расположенном на земельных участках с кадастровыми номерами 500000000005006898 и 500000000005006897, по адресу: г. Минск, ул. Щорса, д. 1А. Площади земельных участков – 0,0092 га и 0,0752 га соответственно. Целевое назначение – земельный участок для размещения объектов административного назначения и земельный участок для эксплуатации и обслуживания здания административно-хозяйственного по ул. Щорса, д. 1А соответственно. Право аренды

В отношении Лота проводятся первые повторные торги. Ранее публикация о продаже лота размещалась в газете «Звязда» № 223 (29592) от 18.11.2021, стр. 13

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **11 января 2022 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127** |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **Начало приема заявлений в 10.00 21.12.2021. Окончание приема заявлений в 16.00 10.01.2022 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Местонахождение имущества** | **г. Минск, ул. Щорса, д. 1А, пом. 9** |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: Задаток для участия в торгах по Лоту 1, СЗАО «ЛадаГарант», проводимых 11.01.2022.

2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). Контактное лицо по вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе – Анаида, тел. (+375 29 308 28 97).

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста составляет 5 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 7 (семи) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться к Дмитрию (+375172197569).**

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **СЗАО «ЛадаГарант», 220014, г. Минск, ул. Щорса, 1А, пом. 16 (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375293953088 (Илья)** |

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Буда-Кошелевский КБО»** (УНП 400035136), 247355, Гомельская обл., г. Буда-Кошелево, ул. Головачева, 10. Тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **21 января 2022 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Установка для чистки подушек «САНАС-3С», РФ, инв. № 00362, 2013 г. в. | 355,00 |
| 2 | Оборудование (3 ед.): швейная машина 22 кл, инв. № б/н, 1989 г. в., швейная машина 22 кл, инв. № б/н, 1976 г. в., швейная машина 22 кл, инв. № б/н, 1979 г. в. | 9,50 |
| 3 | Ксерокс (мультифункц. устройство IR2016 Canon), инв. № б/н, 2008 г. в. | 40,00 |
| 4 | Стол утюжильно-раскладной 1111-1962 РБ, инв. № 541, 2010 г. в. | 265,00 |

**Местонахождение:**
**п. 1 – г. Жлобин, ул. Петровского, 27,**
**п. 2-4 – г. Буда-Кошелево, ул. Головачева, 10.**
**Телефон для ознакомления и осмотра тел. +375 29 135-78-72.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 22.12.2021 г. с 09.00 по 20.01.2022 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 02.12.2021 г.

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Брагинский КБО»** (УНН 400032430), 247632, Гомельская область, г. Брагин, ул. Советская, 31. Тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **21 января 2022 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС (20 %) |
|---|---|---|
| 1 | Гладильный станок Primus, 2010 г. в., инв. № 136 | 420,00 |
| 2 | Комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, 2010 г. в., инв. № 413 | 73,00 |
| 3 | Комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, 2010 г. в., инв. № 300033 | 73,00 |
| 4 | Сушуар, 2008 г. в., инв. № б/н | 16,00 |
| 5 | Кресло детское, 2010 г. в., инв. № б/н | 7,00 |
| 6 | Комплект оборудования для мытья волос, 2010 г. в., инв. № 186 | 118,00 |

**Местонахождение –**
**Гомельская обл., г. п. Брагин, ул. Советская, 31.**
**Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 09.00 22.12.2021 г. по 17.00 20.01.2022 г.: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 02.12.2021 г.

Центр Промышленной Оценки
**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46, www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Строймаш», ул. Рыбалко, д. 26, 220033, г. Минск** |

| Лот, № | Предмет аукциона | Начальная цена, с НДС 20 % | Минимальная цена, с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | **Имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, д. 26 в количестве 5 объектов** | 30 024,00 бел. руб. | 26 688,00 бел. руб. |

**Дата и время начала и окончания торгов: 05.01.2022 в 09.00 по 05.01.2022 в 16.00.**
Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов. **Дата и время окончания приема заявок**: **04.01.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота (по всем лотам)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **7 %** от цены продажи лотов в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

**Контактные данные: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

## Валерый ШАРЫЙ:

Моцныя думкі

# «БЕЗ ПАРАЖЭННЯЎ НЕ БЫВАЕ ПЕРАМОГ»

**Спартсмены — людзі, моцныя не толькі целам, але і духам. Спорт вучыць думаць на тры крокі наперад, аналізаваць сітуацыю і прымаць правільныя рашэнні. Таму ў спартсменаў ёсць чаму павучыцца. У рубрыцы «Моцныя думкі» прапануем даведацца, пра што думаюць спартсмены.**

Валерый Пятровіч Шарый — ва ўсіх сэнсах моцны чалавек. А якім яшчэ можа быць алімпійскі чэмпіён па цяжкай атлетыцы 1976 года! За дзве трэніроўкі на дзень ён падымаў па 32 тоны металу! Цяжкая атлетыка ўмацавала не толькі яго цела, але і дух, як і належыць, праз розныя выпрабаванні. Сёння Валерый Пятровіч трэніруе моладзь ва ўласным клубе, вядома ж, трэніруецца сам і дзеліцца сваімі думкамі. На такім фоне святкуе 45-гадовы юбілей сваёй галоўнай перамогі і ўласнае 75-годдзе.

### «НЕ СТАГНАЎ, НЕ БУРЧАЎ, А ТОЛЬКІ ТРЭНІРАВАЎСЯ»

— **У штангу ўлюбіўся з першага погляду.** Гадоў 12 мне было, у навінах убачыў, як атлет падымае штангу: з аднаго боку — тры бліскучыя бліны, з іншага — ён сам, здаравенны, моцны мужык. Гэта быў двухразовы алімпійскі чэмпіён Аркадзь Вараб'ёў. І так мне тое ў душу запала. Знайшоў дзве жалязякі, паміж імі дубовая галіна — такая ў мяне была першая штанга. Мне было 6 гадоў, калі бацька нас кінуў. Мама паехала ў Мінск працаваць, атрымала кватэру і ў 1960 годзе забрала мяне. Я не ведаю, што было б са мной, калі б застаўся ў Чэрвені. А ў Мінску з'явілася магчымасць займацца цяжкай атлетыкай.

**Казалі, што ў цяжкую атлетыку не возьмуць.** У мой час раней за 16 гадоў у цяжкую атлетыку не бралі. І я чакаў, пакуль мне споўніцца 16. Займаўся барацьбой, нават выступіў на спаборніцтвах, дзе заняў пятае месца з шасці. Расстроіўся, плюнуў і пайшоў. У адчыненае акно ўбачыў, як у зале падымаюць штангі, глядзеў як зачараваны. Падышоў малады трэнер Барыс Давыдавіч Левін, пагледзеў на мае тонкія ручкі і сказаў прыходзіць да яго ў зал займацца. Вось як я прыйшоў у 1964 годзе, так і застаўся ў гэтым на ўсё жыццё.

Насамрэч мне ўжо тады было больш, чым 16 гадоў. Я нарадзіўся 19 лістапада 1946 года. А мама запісала, што 2 студзеня 1947 года, каб я ў армію вясной, а не ўзімку прызываўся. Як яна да гэтага дадумалася ў свае 19 гадоў, не ведаю. Яна мне ў 20 гадоў толькі расказала, што я на паўтара месяца старэйшы. Затое цяпер у мяне два дні нараджэння.

**Днём — работа, вечарам — трэніроўкі.** У 1963 годзе я пайшоў працаваць на завод, трэба было дапамагаць маці. Выступаў за заводскую футбольную каманду, але моцна траўміраваўся. Заняткі цяжкай атлетыкай сумяшчаў з работай, рабіў дэталі для паветравадаў. І трэніраваўся, не стагнаў, не бурчаў. Зразумела, я не ведаў, будзе з мяне нешта ці не. Я проста па адчуваннях разумеў, што кожны дзень расце вынік.

**У зборную ўключылі як маладога спартсмена і добрага чалавека.** У 22 гады я трапіў у нацыянальную зборную СССР. Гэта было вельмі цяжка, канкурэнцыя вялізная. Я нават не спадзяваўся, што траплю ў зборную. У 1969 годзе на чэмпіянаце Еўропы заняў чацвёртае месца, на чэмпіянаце свету — пятае, яны тады праходзілі разам. У асобных практыкаваннях заваяваў тры «серабры» і дзве «бронзы». Тады ўпершыню разыгрываліся медалі ў асобных практыкаваннях, і яны былі ў мяне. Я першы з беларускіх цяжкаатлетаў выступаў на чэмпіянаце свету.

**Алімпійскія гульні — 1972 — самыя складаныя.** Усе адзнакі былі нулявымі, такога ніколі не было. Канкурэнцыя вялізная, што стварала нервознасць. А мы яшчэ і выступалі на крывым памосце, чамусьці ён быў на чатыры сантыметры нахілены. Я штангу падымаю, а яна мяне назад цягне. Першы падыход выцiскаю — здаецца, лёгка, а на месцы



ўтрымацца не магу, сыходжу назад. На другім падыходзе, здаецца, утрымаўся, нагамі ўпёрся. А на трэцім здаўся. Бора Паўлаў сапсаваў падыход. Вася Аляксееў кульбіт зрабіў, такога не было ніколі. У Давіда Рыгерта нулявая адзнака ў рыўку была. Трэнеры зборнай недагледзелі, а ў камандзе чатыры нулявыя адзнакі. Нервозная, непрыемная Алімпіяда была. Я ж туды па «золата» ехаў, чатыры сусветныя рэкорды планаваў устанавіць, але гэты збой — і ўсё. Я ўпершыню ў жыцці назад з месца сыходзіў. Я вельмі цяжка перажываў тое паражэнне. Нават былі думкі кінуць спорт. Але бачыў, што ў мяне ёсць добры запас і трэба ісці далей, прымушаў сябе працаваць.

**Мог бы быць двухразовым алімпійскім чэмпіёнам.** Пасля перамогі на Алімпіядзе 1976 года я рыхтаваўся да Алімпіяды-80. Мы вырашылі з Давідам Рыгертам заваяваць яшчэ па «золацe» і прыгожа сысці. Ён у 100 кг выступаў, а я — у 90 кг. Але ён скінуў 10 кг і «пасунуў» мяне з маёй катэгорыі. Калі б я ведаў, што так будзе, я за паўгода набраў бы дзясятку і выступаў бы ў 100 кг. Я не чакаў, што мой таварыш уставіць мне нож у спіну. Ён потым шкадаваў, але асадак застаўся.

**У 1972 годзе да той злашчаснай Алімпіяды я зрабіў 527,5 кг у трохбор'і.** І гэта вечны рэкорд, які ніколі ніхто не паб'е. Трохбор'е знялі са спаборніцтваў. Былі парушэнні ў тэхніцы, многія хітравалі. Ды і цяжка гэта. У мяне спіна год балела, нават запісалі ў інваліды трэцяй групы. Ты ціснеш, назад адхіляешся, а пазваночнік не павінен назад ламацца. Кожны дзень на працягу 10-15 гадоў — гэта якія нагрузкі! Ды і з трохбор'ем спаборніцтвы праходзілі каля чатырох гадзін, такая пакута.

### «ШЧЫРАВАЎ Я — БУДЗЬ ЗДАРОЎ»

— **Я адразу вызначаю, будзе са спартсмена толк ці не.** Год 1974-ы, выступаў на спаборніцтвах у Брэсце. Іван Лагвіновіч каза: «Пятровіч, паглядзі, зараз мой вучань выступаць будзе». Я паглядзеў і сказаў, што з хлопца толк будзе. Леанід Тараненка выступаў, будучы алімпійскі чэмпіён. Я не памыляюся. Таленавітага цяжкаатлета адразу відаць.

**Трэба спартсменаў з вёсак набіраць.** Я на трэніроўках ірваў па 180 кг, на спаборніцтвах — 175 кг. На грудзі браў па 230 кг, са стоек штурхаў па 235. На спаборніцтвах браў па 220 кг, мог бы і больш, але падыходаў не хапала. Цяпер для некаторых беларускіх спартсменаў гэта недасяжныя лічбы. У Беларусі цяжкая атлетыка ў правале. На чэмпіянаце свету 10 катэгорый у мужчын і 10 у жанчын. Ад Беларусі не паехала ні аднаго дзяўчынка, толькі чатыры мужыкі — гэта рэгрэс абсалютны. А чаму так? Таму што працуюць радавыя трэнеры, якія нічога не дабіліся. Яны за свае месцы трымаюцца і нікога не пускаюць. Я, Лёня Тараненка — мы на задворках. Добра, што ў мяне атрымалася сваю залу адкрыць, дарэчы, адзіную такую ў краіне. Трэба ў рэгіёнах працаваць, хлопцаў з раёнаў набіраць. Я з Чэрвеня, Лёня Тараненка — з Маларыты, мы з дзяцінства былі моцнымі, адсюль і вынікі.

**У беларускай цяжкай атлетыкі можа быць другое жыццё.** Для гэтага трэба стварыць новую каманду, найперш трэнераў. На іх ляжыць адказнасць за няўдачы на спаборніцтвах, допінгавыя праблемы. Трэба мяняць каманду, асвяжаць людзьмі, якія глыбей разумеюць трэніровачны працэс, умеюць навесці дысцыпліну. І самім спартсменам трэба быць нацэленымі толькі на спаборніцтвы, ні на што іншае не адцягваць увагу.

**Я ўсё жыццё шукаю такога спартсмена, як сам.** І не магу яго знайсці. У мяне займаецца добры хлопец Рэнат Рагімаў 1999 года нараджэння, чэмпіён Беларусі сярод юнакоў і сярэбраны прызёр чэмпіянату краіны сярод моладзі. Ёсць шанц у наступным годзе паехаць на чэмпіянат Еўропы сярод моладзі, мы да гэтага імкнёмся. Але ўсё роўна ён не такі, які я быў. Хочацца сустрэць такога заваднога, працавітага спартсмена. Я аддаваў усяго сябе спорту, не шкадаваў сябе. Здаецца, ногі ўжо не могуць ісці, а я на трэніроўку. Праз увесь горад ездзіў. Шчыраваў я — будзь здароў.

**Адпачынак — гэта важна.** Трэба ўмець і адпачываць, і напружвацца, і ўсё гэта спалучаць. Дзесьці можна і віна крыху выпіць, яно добра нервовую сістэму расслабляе. Але з гэтым трэба акуратна. Я бачыў шмат людзей, якія злоўжывалі, і ў спорце яны надоўга не затрымліваліся. Заслужаны трэнер Савецкага Саюза Рудольф Плюкфельдэр, алімпійскі чэмпіён 1964 года. Яму 94 гады — і ён да гэтага часу трэніруецца па тры разы на тыдзень. Вось гэта прыклад! Я таксама трэніруюся, праўда, хворая нага не дае прысядаць. Але жым лежачы 95 кілаграмаў раблю.

**Трэнер для спартсмена павінен быць другім бацькам, а то і першым.** Да нейкага моманту выхоўваюць бацькі, а потым спартсмена выхоўвае трэнер. Я свайго сына Аляксея з сямі гадоў браў з сабой на зборы, на трэніроўкі. Ён у сем гадоў па 25 кілаграмаў падымаў. Я хацеў з яго вялікага спартсмена зрабіць, ён 360 кг падымаў у двухбор'і ў цяжкай вазе. Але дайшоў да майстра спорту і спыніўся, пачаліся траўмы. Ён перайшоў у кіданне молата, там кандыдатам стаў. Кідаць молат таксама нялёгка. Я магу дыск, ядро кінуць, а вось молат не змагу, а сын змог.

### «Я НІКОМУ НЕ ЗАЙЗДРОШЧУ»

— **Мая аддушына — «Перамога».** Некалькі гадоў таму купіў у суседа па гаражы «Перамогу» 1953 года. Дзень праводжу ў зале са спартсменамі, дзень — у гаражы з машынай, усё рамантую. Не ведаю нават, калі змагу на ёй ездзіць. Налета буду фарбаваць: дах будзе светла-бэжавы, а ніз цёмна-карычневы. Паставіў дызельны матор ад «Мерседэса». З гаража выязджае і заязджае назад. Усю машыну разабраў і сабраў сам, а з праводкай пакуль праблема.

**Алімпійскі чэмпіён — гэта назаўжды.** Я па жыцці адказна стаўлюся да свайго звання. Я не магу дзесьці зганьбіцца, трапіць у непрыемную сітуацыю. Я шаную сваё прозвішча і сваё імя. Да сёння, хоць колькі гадоў прайшло. Не ўсім я падабаюся, некаторыя і са злосцю глядзяць, ёсць зайздроснікі. Я нікому не зайздрошчу. Трымаюся таго, што мне ўдалося зрабіць. Хоць я са сваімі магчымасцямі і здольнасцямі мог зрабіць значна больш. Тры Алімпіяды мог выйграць як няма чаго рабіць.

**У 75 усё толькі пачынаецца.** Узрост я не адчуваю. Так, арганізм старэе, але ў душы я хлопец. Люблю свой спорт і не шкадую, што ўсё так склалася. Я сачыў за ўсімі вялікімі спартсменамі, жадаў быць сярод іх і імкнуўся да гэтага як мог. Заўсёды трымаў сябе ў форме, з якой можна было перамагаць. А няўдачы таксама здараюцца, відаць, лёс у мяне такі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

# Беларусы вярнуліся ў эліту сусветнага хакея

**У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем актуальныя спартыўныя навіны**

**ПЕРАМОГА ТЫДНЯ.** Ілья Шымановіч выйграў чэмпіянат свету па плаванні на кароткай вадзе ў Абу-Дабі. Пераможнай для беларуса стала дыстанцыя ў 100 метраў брасам. Вынік у 55,70 секунды прынёс не толькі залаты медаль, але і стаў рэкордам чэмпіянату ў дадзеным відзе праграмы. Другое месца заняў італьянец Нікола Марцiненгі — 55,80 секунды, на трэцім — амерыканец Нік Фінк — 55,87 секунды.

З перамогай Ілью Шымановіча павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Спадзяюся, што ўпэўнены пачатак новага алімпійскага цыкла надасць табе дадатковую матывацыю для заваявання самых высокіх вяршынь», — гаворыцца ў віншаванні.

**ГЕРОІ ТЫДНЯ.** Беларусы заваявалі сем медалёў на Кубку Еўропы па лыжных гонках сярод паралімпійцаў, які праходзіў у Фінляндыі. Валянціна Шыц выйграла гонкі на дыстанцыі 5 і 7,5 км. Юрый Голуб і яго лідар Уладзімір Чапелін перамаглі ў гонках на 7,5 і 12,5 кіламетраў канькавым ходам. Залатыя медалі заваявалі Святлана Сахоненка і яе лідар Дзмітрый Будзіловіч. Яны сталі пераможцамі ў гонках на 5 і 10 кіламетраў. Дэбютант спаборніцтваў Раман Свірыдзенка стаў бронзавым прызёрам гонкі на 7,5 кіламетра.



**ПОСПЕХ ТЫДНЯ.** Хакеісты маладзёжнай зборнай Беларусі U-20 прабіліся ў элітны дывізіён чэмпіянату свету. У заключным матчы сусветнага першынства ў дывізіёне IA беларусы абыгралі сапернікаў з Нарвегіі з вынікам 3:2. Каб заняць першае месца ў групе А і заваяваць адзіную пуцёўку ў элітны дывізіён маладзёжнага чэмпіянату планеты, беларускім хакеістам трэба было не прайграць нарвежцам у асноўны час матча. Такім чынам, беларуская «маладзёжка» набрала 15 балаў з 15 магчымых і вярнулася ў эліту. У папярэдніх гульнях беларусы аказаліся мацнейшыя за каманды Даніі (9:1), Казахстана (4:2), Венгрыі (8:2) і Латвіі (2:1).

**КАМАНДА ТЫДНЯ.** Юніёрская зборная Беларусі U-18 заваявала «серабро» хакейнага турніру зімовага Еўрапейскага юнацкага алімпійскага фестывалю ў Фінляндыі. Каманда Беларусі ў сваім заключным матчы на турніры абыграла каманду Чэхіі з вынікам 3:2.

**МЕДАЛЬ ТЫДНЯ.** Беларус Эдуард Зязюлін, які выступае ў катэгорыі 109 кг, выйграў «малую бронзу» ў практыкаванні «рывок» і заняў чацвёртае месца ў класічным двухбор'і на чэмпіянаце свету ў Ташкенце. Беларус паказаў вынік 447 кг (рывок — 206 кг, штуршок — 241 кг), пабіўшы нацыянальныя рэкорды як у кожным з двух практыкаванняў, так і ў суме двухбор'я.

**ПАЗІЦЫЯ ТЫДНЯ.** Беларуская біятланістка Дзінара Алімбекава скончыла 2021 год на трэцім месцы агульнага заліку Кубка свету. Пасля чатырох этапаў у актыве алімпійскай чэмпіёнкі 327 балаў. На першым месцы нарвежка Марце Алсбю-Ройселан — 417 балаў, на другім — шведская спартсменка Эльвіра Эберг — 387 балаў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

*Свята-Траецкі касцёл, вёска Воўчын Камянецкага раёна*

# ЖАМЧУЖЫНА ПОЗНЯГА БАРОКА

**Пра касцёл у Воўчыне раней пісала неаднойчы, у асноўным, праўда, у кантэксце страчанай спадчыны. Яго векавыя муры ў выглядзе пачарнелых сцен без усялякага даху ды каменні навокал стварылі сабой карціну больш чым сумную. Здавалася, год-другі, і ад помніка архітэктуры позняга барока нічога не застанецца, як не засталося ад многіх гістарычных будынкаў у Воўчыне.**

## ТАЙНЫ СТАГОДДЗЯЎ

Але касцёлу Святой Тройцы быў наканаваны іншы лёс. У 90-я гады яго ўнеслі ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. І напрыканцы 2007 года храм быў перададзены ва ўласнасць Пінскай епархіі Рымска-каталіцкай царквы. На наступны год пачалася рэстаўрацыя будынка. Калі мы ў 2013 годзе купілі дом у суседняй з Воўчынам вёсцы, касцёл ужо не выглядаў занядбаным, ён стаяў ад зямлі да званіцы ў рыштаваннях.

Унікальны Воўчынскі храм трывала асацыіруецца з асобай апошняга караля Рэчы Паспалітай і вялікага князя літоўскага Станіслава Аўгуста Панятоўскага, які тут нарадзіўся, быў ахрышчаны, а потым і перапахаваны. Паводле гістарычных крыніц, фундатарам каменнага касцёла стаў бацька караля — падскарбій ВКЛ Станіслаў Панятоўскі, але давёў да канца будоўлю, аддзелку завяршыў новы гаспадар мястэчка магнат Міхаіл Чартарыйскі. Годам завяршэння будаўніцтва лічыцца 1733-і. Дарэчы, каменны касцёл быў узведзены ўзамен драўлянага, які стаяў доўгі час да гэтага.

Амаль за тры стагоддзі сваёй гісторыі касцёл перажыў многае. Пасля паўстання 1863—1864 гадоў храм быў спачатку закрыты, а потым перададзены праваслаўным вернікам. Амаль сорак гадоў ён прабыў Свята-Троіцкай царквой, а ў 1918 годзе зноў быў вернуты каталікам. Адраджэнне з рамонтам, добраўпарадкаваннем перажыў ужо ў 30-я гады, тады ганарыліся тым фактам, што ў касцёле захоўвалася метрыка Станіслава Аўгуста Панятоўскага, які нарадзіўся ў Воўчыне. А ў ліпені 1938 года з Ленінграда прывезлі труну з астанкамі караля. Мясцовыя жыхары — з тых, хто дапамагаў на цырымоніі, — расказвалі пазней сваім дзецям, што, акрамя труны, былі яшчэ карона, шабля, плашч, урна з забальзамаваным сэрцам. Усё гэта замуравалі ў крыпту. Але ў 1945 годзе касцёл закрылі. Яшчэ праз 43 гады знойдзеныя навуковай экспедыцыяй пад крыптай рэшткі абшыўкі труны, кавалкі плашча, іншыя прадметы былі перавезены ў Варшаву. Куды дзелася астатняе, ніхто не ведае.

## МАЛАЯ РАДЗІМА КАРАЛЯ

А вось касцёл выкарыстоўваўся тутэйшай гаспадаркай як склад мінеральных угнаенняў і ядахімікатаў. Наогул, дзіва, што сцены выстаялі, не абрынуліся, раз'едзеныя солямі і ядамі, як аднойчы абрынулася званіца. І тады касцёл быў бы там, дзе сёння знаходзіцца маёнтак, — у небыцці. Ад велічнага некалі сядзібнага палаца засталіся фрагменты воднай сістэмы — вадаёмы, каналы, якія зарастаюць. Раней паміж гэтымі каналамі знаходзіліся аранжарэі, у якіх раслі мандарыны, апельсіны, іншыя паўднёвыя дрэвы. А перад маёнткам быў незвычайны вадаём. Дно штучнага возера выклалі шклом, а ў вадзе плавалі экзатычныя рыбкі.

Пра багацце і прыгажосць тутэйшых палацаў складалі легенды. Дачка Казіміра Чартарыйскага, гаспадара Воўчына, Канстанцыя выйшла замуж за Станіслава Панятоўскага, бацьку будучага караля. Станіслаў-малодшы нарадзіўся ў 1732 годзе. Вучыўся, дарэчы, спачатку тут, у Воўчыне, у школе, якую арганізавала яго маці. Гэтыя звесткі ёсць у кнізе Анатоля Федарука «Старадаўнія сядзібы Берасцейшчыны». Да гонару Панятоўскіх, нягледзячы на сваю еўрапейскую вядомасць, яны трывала асацыіравалі сябе з малой радзімай. Аўтар піша: «Сваё паходжанне Панятоўскія тлумачылі лаканічна: «Мы лічым сябе радавітымі ліцвінамі, бо нарадзіліся і прынялі святое хрышчэнне ў Воўчыне, каля Брэста, а ў рыцарскім стане займалі пасаду стольніка літоўскага...».

Асобу апошняга караля Рэчы Паспалітай гістарыкі звычайна называюць трагічнай. У многім ён быў перадавым чалавекам свайго часу — апекуном, фундатарам, аматарам мастацтва і навук. Засталіся сведчанні аб тым, што кароль наведваў прэм'еры балетных пастановак у Ружанскім палацы. Ён застаўся ў памяці сучаснікаў як кароль-рэфарматар. Пры ім была прынята Канстытуцыя 1791 года, першы падобны дакумент у Еўропе. Але ракавым для яго заўсёды быў расійскі прастол. Не без падтрымкі Кацярыны II Станіслаў стаў каралём Аўгустам II. Па яе волі адбыліся тры падзелы Рэчы Паспалітай, пад яе прымусам ён адракаўся ад свайго прастола ў 1795 годзе. Праз два з паловай года пасля адрачэння былы кароль памёр. Пахаваны быў у Санкт-Пецярбургу ў касцёле святой Кацярыны. На каменнай пліце, пад якой змяшчалася крыпта, планавалі паставіць помнік. Але гэта не адбылося. І спакой аказаўся не вечным. І прах караля вярнуўся ў Воўчын. Недзе тут ён і развеяны.



Такім быў касцёл у 2008 годзе.

У вёсцы жыве легенда, што пасля закрыцця касцёла астанкі караля ноччу тайна вывез і пахаваў набожны і адукаваны вясковец Антон Пратасюк. Пасля таго як храм зачынілі, а святары з'ехалі, маёмасць рабавалі, святыню апаганьвалі, вось хрысціянін не ўтрываў і пахаваў па-чалавечы астанкі. А пра ўчынак свой маўчаў і тайну месца пахавання забраў у магілу. Але найбольш верагоднай выглядае іншая версія, што астанкі прывезлі з Ленінграда ў дрэнным стане, бо крыпту там неаднойчы падтаплівалі воды Нявы. І ад касцёл да гэтага часу ў любым выпадку нічога не засталося, таму і шукаць іх не варта. Гэтай версіі прытрымліваўся, дарэчы, і польскі архітэктар Віктар Вільк, які аднавіў Воўчынскі касцёл.

## АДНАЎЛЕННЕ

Да гэтага ён ужо аднаўляў мінскі кафедральны касцёл Прасвятой Дзевы Марыі — галоўную каталіцкую святыню краіны, а таксама рэстаўрыраваў касцёл Успення Дзевы Марыі ў Пінску, манастыр францысканцаў, дзе цяпер знаходзіцца Міжепархіяльная вышэйшая духоўная семінарыя імя святога Тамаша Аквінскага.

Рэстаўратар прыйшоў у вёску ў 2009 годзе. А ў 2014-м у размове з журналістамі расказаў, як, пераглядаючы фотаздымкі, зробленыя пяць гадоў таму, зразумеў, што час пражыты не дарэмна. Воўчынскі касцёл ён назваў тады сваёй лебядзінай песняй. Такіх касцёлаў, узведзеных у стылі позняга барока, па ўсёй Еўропе толькі тры. У раскопках і рэстаўрацыі Вільку дапамагаў дацэнт гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Аляксандр Башкоў.

Паступова над касцёлам з'явіўся дах, заняла сваё ранейшае месца вежа з гадзіннікам. Гадзіннік тут быў асаблівы: яго цыферблаты, арыентаваныя па чатырох баках свету, паказвалі час, адкуль бы ты ні паглядзеў на храм. Пад заваламі знайшлі фрагмент аднаго з цыферблатаў са стрэлкай, што дазволіла не толькі аднавіць аблічча гадзінніка, але і яго параметры. Цяперашні гадзіннік стаў дакладнай копіяй таго, які стаяў тут некалі і які яшчэ памятаюць самыя сталыя вяскоўцы. Дыяметр цыферблата складае 1,42 метра. А механізм уманціраваны сучасны, ім кіруе складаная электроніка.

Праз чатыры гады ад пачатку рэстаўрацыі наверх узнялі скульптуру евангеліста Іаана. Раней тут было чатыры скульптуры евангелістаў. Нейкім цудам ацалела адна з іх, іншыя тры — Марк, Мацвей і Лука — даўно пападалі і паразбіваліся. Аднавіў Іаана беларускі скульптар Мікалай Андрэеў. Так павольна, крок за крокам набываў касцёл свае старыя-новыя рысы.

Яшчэ Віктар Вільк расказваў, што пры раскопках знайшлі магілу Антонія Чартарыйскага 1744 года пахавання, а таксама рэшткі іншых пахаванняў. А вось капсулу «фундатараву», якую звычайна закладваюць у аснову фундамента, не знайшлі.

## ІМША Ў ГОНАР АДРАДЖЭННЯ

На жаль, у лютым 2016 года архітэктар Вільк памёр, так і не скончыўшы свой воўчынскі праект. І рэстаўрацыя часова прыпынілася. Але з дапамогай ААТ «Белавежская», Камянецкага райвыканкама, фундатараў асноўную частку работы ўдалося скончыць. І ў лістападзе мінулага года біскуп Пінскі Антоній Дзям'янка здзейсніў абрад блаславення аднoўленага касцёла.

Убранне храма пакуль сціплае. Справа ад увахода размешчаны спісак іконы Божай Маці Воўчынскай. На сценах па перыметры — 14 абразоў новазапаветнага эпізоду «Хрэсны шлях Ісуса Хрыста». Іх захавалі мясцовыя жыхары.

Пакуль што напаўразбураныя статуі трох евангелістаў прытуліліся на падлозе. Яны чакаюць свайго часу, каб быць аднoўленымі і заняць свае месца на даху. Настаяцель храма Андрэй Барoдзіч лічыць, што вельмі важна вырашыць лёс будынка насупраць касцёла. Некалі менавіта там быў палац Чартарыйскіх, потым на яго месцы пабудавалі лячэбню. Пасля вайны доўгі час у ёй размяшчалася праўленне калгаса. У 90-я будынкам зацікавілася мясцовая гаспадарка, яго часткова аднавілі, планавалі размясціць музей, але кіраўніцтва памянялася, новаму ж ідэя падалася нецікавай, працэс прыпыніўся.

Цяпер землі ў ваколіцах Воўчына перайшлі ў валоданне эканамічна моцнай і адметнай у вобласці і раёне гаспадаркі ААТ «Белавежскі». З'явілася надзея, што і гэты будынак набудзе новае жыццё. Добраўпарадкаванне тэрыторыі вакол касцёла «Белавежскі» ўжо праводзіў. Зараз яго спецыялісты займаюцца капітальным рамонтам і рэстаўрацыяй вялікай пабудовы, якая шмат гадоў стаяла без прымянення ў цэнтры вёскі. За польскім часам гэта была гміна, адміністрацыйны будынак мясцовай улады. Калі знялі слой позняй тынкоўкі, адкрыўся адпаведны надпіс. Паводле слоў старшыні Воўчынскага сельскага Савета Віктара Палешчука, тут будуць кватэры для работнікаў сельгаспрадпрыемства. Абноўлены будынак упрыгожыць сабой цэнтральную вуліцу.

...У нядзелю ранкам адчыняюцца дзверы касцёла, праходзіць нядзельная імша. Зусім побач, менш чым за 500 метраў, пачынаецца богаслужэнне і ў старадаўняй праваслаўнай царкве Святога Мікалая. Менавіта тут давялося пачуць, што Камянец — гэта галава Камянецкага раёна, Высокае — яго сэрца, а ў Воўчыне — яго душа. Калі пачынаюцца богаслужэнні ў храмах, верыцца, што жыве душа.

* * *



Такі ён цяпер.

Цікава, што, нягледзячы на пандэмію, амаль кожныя выхадныя каля касцёла спыняюцца экскурсійныя аўтобусы альбо машыны з сем'ямі, вандроўнікамі-адзіночкамі: падыходзяць, разглядаюць, фатаграфуюць. Значыць, многім цікавая гісторыя гэтых месцаў. А яна, гісторыя, пакінула свой след тут ледзь не на кожным метры. Чаго варты драўляны крыж, які перажыў усе войны, рэвалюцыі ды навальніцы! Ён адзначаны на карце 1762 года. Людзі верылі ў яго жыватворную сілу і прыносілі яму розныя ахвяры. Вось і цяпер на крыжы вісяць рознакаляровыя стужкі. Іх павязваюць дзяўчаты так, як рабілі некалі іх бабулі і прабабулі. Ды шмат чаго ёсць цікавага ў Воўчыне. Значыць, музей быў бы запатрабаваны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**

# «ТУТ ЗЯМЛЯ ТАКАЯ...»

## Пяць незвычайных фактаў пра Сцяпана Александровіча

*«Бацькі мае — беларускія татары. Можа гэта гучыць крыху дзіўна, але сапраўды так. У Капылі здаўна жыла жменька нашчадкаў мангольскіх плямён. Сядзібы іх туліліся на дзвюх вулачках — Татарскай і Замкавай, ля плыценькай Каменкі, побач з высокім замчышчам (паводле падання, усе яны некалі складалі асабістую ахову капыльскага князя). У этнаграфічным абліччы мясцовых татар захаваліся яшчэ ўсходнія рысы, сяк-так ліпелі свае звычаі і абрады, але родную мову яны ўжо даўно страцілі і гаварылі па-беларуску. Большасць сем'яў выраблялa аўчыны і скуры, некаторыя займаліся агародніцтвам ці проста земляробствам. Увогуле капыльскія татары цесна зжыліся з мясцовым насельніцтвам і ў сваім штодзённым побыце мала чым адрозніваліся ад беларусаў».*

Так пісаў у сваім аўтабіяграфічным нарысе Сцяпан Александровіч, літаратуразнаўца, крытык, пісьменнік, які нарадзіўся 100 гадоў таму ў Капылі. Менавіта ён згадваецца ў паэме «Сказ пра Лысую гару» на пару з Генадзем Кісялёвым, як прыклад дасціпнага даследчыка:

*«Адкрыліся аўтара не зробіць —*
*Хоць зад натрэ да мазалёў —*
*Ні крот Сцяпан Александровіч,*
*Ні кротус Генус Кісялёў!»*

Мала хто і з беларусаў зрабіў столькі для нашай культуры і гісторыі, як беларускі татарын Сцяпан Александровіч, мала хто заслугоўвае такой павагі і ўдзячнай памяці. Давайце ж сёння ўспомнім, якія незвычайныя факты пра яго можна згадаць.


Сцяпан Александровіч і Іван Шамякін.

### 1. У юнацтве быў гарбаром

Дарэчы, мала хто ведае: сапраўднае імя Сцяпана Александровіча — Мустафа, але з дзяцінства ўсе звалі яго Сцяпанам.

Паводле ўспамінаў Александровіча, яго бацька Хусейн Самуілавіч жыў у Капылі на Татарскай вуліцы, але пасля жаніцьбы купіў сабе хату на Какорыцкай, якраз насупраць школы.

*«Ён вырабляў аўчыны, і я з маленства авалодваў нялёгкім гарбарным рамяством...»*

Праўда, гэта не адзіная «пабочная» прафесія, якой авалодаў будучы літаратуразнаўца.

*«Чатыры гады я адгакаў на пастуховай «службе». Даводзілася несалодка: прыходзілася прапускаць урокі, адставаць жа ад хлопцаў не хацелася, у пячонку ўядалася дажджлівая восень. Але самае цяжкае было ў тым, што ў торбе часам толькі кніга і некалькі сырых бульбін...»*

Так, увесь гэты час Сцяпан, як і яго сябар Іван Шамякін, які ў дзяцінстве таксама быў пастушком, апантана чытаў, а пастухова справа да таго ж — магчымасць рэфлексій на прыродзе.

### 2. Выпрошваў у бібліятэцы вершы расстраляных паэтаў

*«З старэйшых працаўнікоў на ніве беларушчыны хачу найперш згадаць Сцяпана Хусейнавіча Александровіча, які разам з М. Ларчанкам рыхтаваў першыя пасляваенныя выданні Ядвігіна Ш., Максіма Багдановіча і іншых класікаў. Сцяпан Александровіч быў на фронце, прайшоў праз палон, аднак назаўсёды захаваў настальгію па часе «беларускага актывізму», хаця сам яго фактычна і не бачыў. Помню, расказваў мне, як маладым капыльскім хлопцам ён выпрасіў у бібліятэкара кніжкі расстраляных беларускіх пісьменнікаў, якія бібліятэкар павінен быў спаліць і, надзейна іх схаваўшы, запоем чытаў забароненую беларускую літаратуру»* — згадваў вядомы літаратуразнаўца і фалькларыст Арсень Ліс.

Александровіч заўсёды імкнуўся парушыць маўчанне пра рэпрэсаваных пісьменнікаў і іх лёсы, хоць пра гэта забаранялася гаварыць. Калега Александровіча Дзмітрый Бугаёў успамінае:

*«Вось у кнізе «Тут зямля такая» (1974) ён падышоў да арышту Кузьмы Чорнага восенню 1938 г. Але пра той арышт і турэмнае зняволенне, якое жахлівым цяжарам абрынулася на пісьменніка, з-за цэнзурнай забароны нельга было сказаць ні ў 1964 г., калі пісаўся артыкул, ні праз дзесяцігоддзе, калі праца перадрукоўвалася ў кнізе. Даследчык мусіў у абодвух выпадках абмяжоўвацца такой фразай: «Захварэла жонка, і Кузьма Чорны позна ўвечары 13 кастрычніка 1938 года пайшоў у аптэку па лекі, а дамоў вярнуўся толькі 8 чэрвеня 1939 года». Але змірыцца з такім глуха-няўцямным дакрананнем да вялікай бяды С. Александровіч не мог. І як цэнзурныя ўмовы змяніліся, ён даў волю сваім пачуццям, растлумачыўшы, што 13 кастрычніка 1938 г. Чорны не вярнуўся з аптэкі дамоў, бо «яго арыштавалі ля пад'езда дома».*

Як сцвярджаў Бугаёў, у выпадках, калі з-за ўмоў часу нельга было распавесці ўсю праўду пра кагосьці з пісьменнікаў, «Александровіч, здаецца, фізічна пакутаваў».

### 3. Яго бацька быў знаёмы з Цішкам Гартным

Капыльшчына — унікальная мясціна, адкуль родам дзясяткі слынных літаратараў. Адзін з іх — Цішка Гартны, ён жа Зміцер Жылуновіч, які яшчэ ў 1910—1911 г. ініцыяваў выпуск у Капылі рукапісных часопісаў. У свой час Жылуновіч у тым самым Капылі быў такім жа гарбаром, як і бацька Сцяпана Александровіча. Так што не дзіўна, што яны былі знаёмыя. Александровіч-старэйшы ведаў на памяць верш Цішкі Гартнага «Песня гарбара»:

*«Цэлы дзень я за брудным сталом,*
*Цэлы дзень скуру цвёрдую скроб,*
*Стаючы укапаным калом,*
*Я задухай атрутнаю соп».*

Калі Сцяпан Александровіч нарадзіўся, Цішка Гартны жыў у Мінску, узначальваў Дзяржвыдавецтва і Цэнтральны архіў БССР, працаваў намеснікам наркама асветы і старшынёй Галоўмастацтва БССР.

*«Асаблівай павагай і аўтарытэтам карыстаўся ў мястэчку Цішка Гартны. Кожны яго прыезд на радзіму быў цэлай падзеяй у жыцці Капыля. Я хлапчуком некалькі разоў бегаў на Свяржэнскую вуліцу, каб паглядзець аўтара «Сокаў цаліны». Пасля, пасучы каровы, я некалькі разоў бачыў яго ў полі: Ц. Гартны любіў блукаць па капыльскіх ваколіцах, па тых сцежках, дзе прайшло яго пастухоўскае маленства».*

Яшчэ Александровіч успамінаў, як у снежні 1936 года адзначалася стагоддзе яшчэ аднаго капылянца — класіка яўрэйскай літаратуры Мендэле Мойхер-Сфорыма, і ў Капыль прыехалі Кандрат Крапіва, Ізі Харык, Майсей Кульбак, армянскі паэт Наіры Зар'ян, падчас урачыстасці Крапіва чытаў байку «Дзед і баба».



Кніга Сцяпана Александровіча.

Сястра Александровіча Аніфа расказвала: *«Пасля ўрокаў да нас часта заходзілі аднакласнікі і сябры Сцяпана. Збіраліся і ў святочныя дні, спявалі, танцавалі, чыталі вершы».*

Сябраваў Сцяпан з аднакласнікам свайго брата Аляксеем Коршакам, які аднойчы зайшоў да іх у госці. *«Сарамяжы і скупы на слова хлопец узяў тады ў нас добры дзясятак кніг, і — о, дзівак! — усё гэта былі зборнікі вершаў. Праз некалькі дзён ён зноў выбіраў кнігі, а праз які месяц-два стаў у нашым доме сваім чалавекам».*

Разведчык Коршак загінуў на фронце 27 лютага 1945 г. Адзін з яго апошніх лістоў быў адрасаваны Сцяпану Александровічу: *«Зараз я знаходжуся на фронце ва Усходняй Прусіі. Пішу табе ліст у бліндажы пад гром артылерыйскай кананады. <...> Прыслаў бы табе сваіх вершаў, але не маю больш паперы. Іншым разам напішу больш і прышлю вершы...»*

«Тут зямля такая» — казаў Сцяпан Александровіч пра багатую на таленты Капыльшчыну.

### 4. Уцёк з нямецкага палону

У 1939-м будучы прафесар паступіў у БДУ. А ў 1940 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію. Праз год пачалася вайна...

У 1942-м, калі ішлі цяжкія баі, чырвонаармеец Сцяпан Александровіч удзельнічаў у Керчанска-Феадасійскай аперацыі. 16 мая 1942 г. каля старой крэпасці Янікале ён быў паранены, а праз тыдзень трапіў у палон і апынуўся ў лагеры ваеннапалонных у Крывым Розе.

*«Увогуле жыццёвы тэмп быў незвычайны: у 18 год я быў у арміі, у 20 — на фронце, а ў 21 — у палоне».*

Як піша адзін з яго вучняў, Язэп Янушкевіч, *«мусульманская вера бацькоў уратавала яго, калі адзін з барачных фюрэраў ставіў яго да сцяны, істэрычна выдыхаючы ў твар: «Юдэ!» Жыццё яму вярнуў працытаваны па памяці ўрывак з Карану».*


Сцяпан Александровіч і Аляксандр Коршак.

Разам з сябрамі-ўкраінцамі Александровіч уцёк у жніўні 1942 года. Два месяцы пакутлівых блуканняў... Ужо на роднай Беларусі, пад Слуцкам, зваліўся з ног. Злітаваўся нейкі дзядзька, падабраў хворага, прывёз у Капыль.

*«...пацягнуліся пакутлівыя дні дамашняга арышту. З хаты не пускала хвароба (з лагера прынёс працэс у лёгкіх), баяўся і чужога вока. На легальнае становішча перайшоў канчаткова вясною 1943 года. З гэтага часу ў мяне ўжо наладзіліся сувязі з партызанамі, якім бацька вырабляў аўчыны і круціў сырамяць на збрую».*

Калі былы вязень ачуняў, удзельнічаў у баявых аперацыях, каардынаваў дзейнасць падполля, быў сувязным 27-й брыгады імя Чапаева. У 1944 годзе сям'я не магла больш заставацца ў Капылі — немцы і паліцаі сталі нешта падазраваць. Вырашылі ісці ў партызаны.

У ліпені 1944 г. Сцяпан Александровіч — зноў у Чырвонай Арміі. Служыў у танкавым батальёне, затым у роце сувязі лыжнага батальёна, потым у горнастралковым палку ў Баку.

Пасля свае выпрабаванні ён апіша ў дакументальнай аповесці «Далёкія зарніцы».

### 5. Быў адметным лектарам

Мару прысвяціць жыццё літаратуры Сцяпан Хусейнавіч здзейсніў пасля вайны. У БДУ ён, па ўспамінах Дзмітрыя Бугаёва, быў адным з яркіх і адметных лектараў: *«Лекцыі ён чытаў без паперак, гаварыў павольна, часам ціха, як бы напаўголаса. Праўда, раптоўна надараліся прыступы кашлю, у прафесара былі хворыя лёгкія: цяжкая спадчына ваеннага часу. Думка лектара літаратуры была дакладнай, кожнае слова выверана, быццам узважана на нейкіх унутраных шалях, ён цудоўна помніў усе лічбы і факты. Глыбока, да драбніц ведаў біяграфіі Багушэвіча, Дуніна-Марцінкевіча, Купалы, Коласа, Цёткі».*

На ягоным рахунку не толькі навуковыя манаграфіі і артыкулы. Бугаёў казаў пра яго мастацкія творы: *«Напісана так, што ад кнігі нельга адарвацца».*

Напісанае Сцяпанам Александровічам засталося... І няхай яно па-ранейшаму будзе мець свайго чытача.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

---

Кніжныя навінкі

## ГІСТОРЫЮ ЭКСЛІБРЫСА ВЫКЛАДАЕ БІБЛІЯФІЛ АЛЕГ СУДЛЯНКОЎ

**У Выдавецкім доме «Звязда» падрыхтавана да друку кніга вядомага ў Беларусі і за яе межамі экслібрысіста Алега СУДЛЯНКОВА «Гісторыя беларускіх кніжных знакаў. XVI — XX стст.»**

Дасведчаны кніжнік Алег Аляксандравіч раскажае гісторыю айчыннага кніжнага знака, паказвае яго месца ў лёсе найцікавейшых кніжных збораў, пра некаторыя з якіх, на вялікі жаль, да сённяшняга часу захаваліся толькі ўспаміны.

— Часта, адгарнуўшы вокладку кнігі, якая нам спадабалася — мы і не звяртаем увагі на адбіты на вокладцы герб ці не заўважаем прыклеенага з унутранага боку вокладкі лісток з лацінскім надпісам «Ex libris...» альбо «З кніг...» І дарэмна, — расказвае **загадчык кніжнай групы Выдавецкага дома «Звязда» Наталля ШЧАРБАКОВА**. — За такімі надпісамі, за малюнкамі, якія характарызуюць змест таго ці іншага кнігазбору, зацікаўлені яго ўладальніка, — вялікая, красамоўная гісторыя. Алег Судлянкоў прапанаваў нам выданне, якое асвятляе гісторыю кніжнага знака ў Беларусі і памежных краінах за некалькі мінулых стагоддзяў. Чытаючы кнігу слыннага бібліяфіла, здаецца, дыхаеш кніжным паветрам, падарожнічаеш па розных бібліятэках... Такой кнігі не толькі ў нашым выдавецтве, але і ў кнігавыданні апошніх дзесяцігоддзяў, на мой погляд, не было. Зараз сітуацыя выпраўляецца. Лічу, што бібліятэкі краіны будуць лічыць за гонар мець у сваіх зборах такое выданне.

Выпуск кнігі Алега Судлянкова «Гісторыя беларускіх кніжных знакаў. XVI — XX стст.» запланаваны на першы квартал 2022 года, да чарговай — XXIX па ліку — Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу.

**Сяргей ШЫЧКО.**



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | **УПП «Севласт» г. Гродно, 230001, г. Гродно, ул. Соколовского, 22** |

**Предмет электронных торгов**

**НЕЗАВЕРШЕННОЕ ЗАКОНСЕРВИРОВАННОЕ КАПИТАЛЬНОЕ СТРОЕНИЕ**

(здание неустановленного назначения), инв. номер 401/U-156462, процент готовности – 73 %, по адресу: Гродненская обл., Гродненский р-н, Озерский с/с, аг. Озеры, ул. Рабочая, 41.

***Сведения о земельном участке:*** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания дома рыбака общ. пл. 0,1394 га.

***Ограничения (обременения) прав:*** водоохранная зона пл. 0,1394 га

**Начальная цена без НДС – 295 000 долларов США.**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** по курсу НБРБ на дату платежа от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY92 BELB 3012 0048 3500 8022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа: ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор победителю аукциона для подписания |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | В соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен договором купли-продажи |

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **2 (два) %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
**Начало торгов: 11.00 21.01.2022 г.**
**Окончание торгов: 13.00 21.01.2022 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **20.01.2022 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

## Извещение о проведении 12 января 2022 года аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества ОАО «Общепит «Школьник»

**Наименование объекта и его местонахождение:**

**КАПИТАЛЬНОЕ СТРОЕНИЕ с инвентарным номером 110/С-90340, г. Барановичи, ул. Чернышевского, 69Ж**

Арендуемая площадь, м$^2$ – 214,0.

**Характеристика объекта:** имеется электроснабжение, развитая транспортная инфраструктура.

Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 53,5 базовой арендной величины.

**Сумма задатка:** 53,5 базовой арендной величины.

**Условия аукциона:** организация деятельности, предусмотренной законодательством РБ, в соответствии с санитарными нормами и противопожарными требованиями, за исключением размещения игорных заведений.

**Срок аренды капитального строения:** 3 года.

Коэффициент к базовой ставке арендной платы в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду и (или) от использования арендуемого имущества: -0,7-.

**Размер уплачиваемого штрафа:** сумма внесенного задатка.

**Арендодатель объекта, его местонахождение:** ОАО «Общепит «Школьник», Брестская обл., г. Барановичи, ул. Красноармейская, 4.

**Организатор аукциона:** ОАО «Общепит «Школьник».

1. Аукцион состоится **12.01.2022 года** в 12.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Красноармейская, 4, (2-й этаж).

2. Для участия в аукционе необходимо:

а) представить организатору аукциона заверенную банком копию платежного поручения либо иного документа о перечислении суммы задатка на расчетный счет BY02BLBB 30120200167591001001 в ЦБУ № 405 ОАО «Белинвестбанк», г. Барановичи, БИК BLBBBY2X, г. Барановичи, ул. Димитрова, 15, УНП 200167591, ОКПО 01567973, срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе; задаток перечисляется в белорусских рублях в зависимости от размера базовой арендной величины, установленной на день оплаты;

б) подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе установленной формы с приложением следующих документов: юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и документ, удостоверяющий личность; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов на участие в аукционе представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие;

в) заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. После регистрации организатором аукциона заявления со всеми необходимыми документами лицо, желающее принять участие в аукционе, считается допущенным к участию и получает билет участника аукциона.

